PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 3 (2488) Год XLIX Беласток, 18 студзеня 2004 г. Цана 2,00 зл.

Так не скончыцца

Солтыса Райска Аляксандра Тышука выклікалі ў Павятовую камендатуру паліцыі у Бельску. Яна Морданя — старшыню таварыства „Гай" — паліцыянты самі наведалі ў хаце ў Гацьках. Абодвум пагражае 193 артыкул Крымінальнага кодэксу — уварванне на чужую нерухомую маёмасць. Такі фінал сустрэчы з дырэктарам Сувальскага філіяла Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці Людгердам Рагоўскім, якая прайшла 9 снежня 2003 г. у вясковай святліцы ў Райску.

Сустрэча датычыла зямлі. Прынялі ў ёй удзел гаспадары з Райска, Гацькоў, Храбалоў і Парцава ды прадстаўнікі Гміннай управы ў Бельску.

— Нашы дзяды не даядалі, а нажывалі загоны, — кажа Валянцін Галушэўскі з Парцава. — Каб яны цяпер усталі і пабачылі, што мы махнулі рукою на тую спадчыну, то не адзін кіёчак трэснуў бы на нашых спінах.

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

Рэч ідзе пра зямлю абанкручаных сельскагаспадарчых камбінатаў у Райску, Гацьках (пісаў я пра гэта ў 41-м нумары „Нівы" за мінулы год) і Парцаве.

— У нас пад ПГР пайшлі землі гаспадароў, якія не змаглі справіцца з падаткамі і абавязковым кантынгентам, — гаворыць Дзмітры Артэмюк, солтыс Парцава ад 1969 года.

— І як нам цяпер яе вярнуць, калі не можам заплаціць столькі, што прыезджыя бізнесмены? — пытаецца Валянцін Галушэўскі.

Агенцтва сельскагаспадарчай нерухомасці правяло 23 верасня аўкцыён на арэнду гэтай зямлі. Ніхто з мясцовых не набыў ні гектара. Гаспадары палічылі, што не ў змозе плаціць за гектар цану дзвюх з паловаю тон пшаніцы ў год. Столькі за парцаўскую зямлю дала фірма „Адлер".

Сяляне хацелі б, каб аўкцыён быў абмежаваны да іх мясцовасцей. Сталі шукаць падтрымкі ў палітыкаў. Пасол Сейма Яўген Чыквін запрасіў жыхароў Парцава ў парламент, на пасяджэнне Камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей. І стаў лабіраваць калегаў парламентарыяў, каб у законах запісаць гарантыі ўласнасці зямлі на этнічна змешаных абшарах.

— Не ведаю, ці ўдасца ўвесці такі запіс у будучы Закон аб нацыянальных меншасцях, — гаворыць ён, — але можна навелізаваць Закон аб зямельнай маёмасці так, каб першы аўкцыён быў абмежаваны да тых мясцовасцей, на тэрыторыі якіх ляжыць зямля. І толькі, калі мясцовыя не будуць ёю зацікаўлены, выставіць на агульны аўкцыён.

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

Яна Морданя — старшыню таварыства „Гай" — паліцыянты самі наведалі ў хаце

Пасол Чыквін звярнуўся да старшыні Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці ў Варшаве з просьбай спыніць абарот зямлёю ў чатырох паветах: Беластоцкім, Бельскім, Гайнаўскім і Сямятыцкім да навелы Закона аб сельскагаспадарчай маёмасці. У гэтых паветах дзяржаве належыць каля 10 працэнтаў усіх угоддзяў.

— На нашу, беларусаў, тоеснасць найбольшы ўплыў маюць тры фактары, — кажа Яўген Чыквін: — мова, праваслаўная вера і зямля. Таму захаванне структуры ўласнасці на ўсходняй Беласточчыне вельмі важнае для будучыні нашай грамадскасці. Усім тым, якія кажуць, што я фаварызую беларусаў, адказваю, што скарыстаюць на тым і мясцовыя палякі. А такая законная развязка будзе спрыяць захаванню характару гэтай зямлі, апошняга шматка многанацыянальнай Рэчы Паспалітай, спадчынай якой палякі так ганарацца.

* * *

Снежаньская сустрэча ў Райску, гэта вынік так афіцыйнага звароту дэпутата Сейма, як і старанняў раенскіх ды гацькоўскіх гаспадароў. Закончылася яна пагадненнем. Галоўныя яго пункты наступныя:

— Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці спыніць абарот свабоднымі пакуль 200 гектарамі ў Гацьках, Райску, Храбалах, ды больш-менш такім участкам у Парцаве, Відаве і Леўках да высвятлення, ці аўкцыён на яе продаж або арэнду можа быць абмежаваны да гэтых мясцовасцей;

— Сувальскі філіял Агенцтва звернецца з такім запытаннем да свайго кіраўніцтва ў Варшаве;

— гаспадары падрыхтуюць праект падзелу свабоднай зямлі на ўчасткі, якую змогуць загаспадарыць;

— Агенцтва не будзе пакуль прадаваць арандаваных участкаў;

— гаспадарчыя будынкі былога камбіната ў Гацьках прызначыць для асобнага загаспадарання ў сувязі з зацікаўленнем імі таварыства „Гай".

* * *

Карыстаючыся візітам рэдкіх гасцей з Сувалкаў, раенскія ды гацькоўскія гаспадары паказалі ім, што робіцца з нерухомай маёмасцю, якою ад імя дзяржавы Агенцтва адмініструє. Станіслаў Жахоўскі, які яшчэ не падпісаў дамовы на арэнду зямлі ў Райску, зааграў не толькі той участак, але і 6-метровую дарогу. Войцех Пароўскі, які ў Райску гадуе гусей, дапусціўся дэвастацыі абораў, — гаварылі. Як ён гаспадарыць, відно ўжо каля брамы: у загарадзе два на два метры кідаецца на платы з ашчэранымі зубамі аграмадная каўказская аўчарка. Поўсць невядомага колеру ўся ў струках — сабака стаіць па калені ў гаўне.

Брама адчыненая. Работнікі вывозяць гной. У якім стане аборы і ў якіх варунках трымаюць там гусей — не напішу, бо не хачу мець дачынення з паліцыяй. Уваход на пляц былога ПГРа ў Райску стаў прычынай зацікаўлення органаў Аляксандрам Тышуком і Янам Морданем. Таму я лепш застануся сведкай падзей з-за плота. Але я выразна бачыў, як дырэктар Людгерд Рагоўскі хадзіў між гаспадарчымі будынкамі і круціў галавой з выразным незадавальненнем. А потым — у святліцы — гаварыў, што разважыць магчымасць датэрмінова скасаваць дамову з цяперашнім арандатарам.

Шаноўныя паліцыя і пракуратура! Прашу ўлічыць гэтую акалічнасць у ходзе справы.

Мікола ВАЎРАНЮК

PS. Я ўпэўнены, працяг будзе.

Утрымаць ліцэй ☞ 2

Марцін РЭМБАЧ

Уладзімір Колас: У гэты раз міністэрства вырашыла расправіцца з намі канчаткова. Перыяд кампрамісаў скончыўся, тым больш што мы заключалі іх некалькі гадоў раней з зусім іншымі людзьмі. На пасадзе дырэктара я перажыў чатырох міністраў адукацыі (...) Тыя, што прыйшлі ў міністэрства ў апошні перыяд, не маюць маральных бар'ераў, яны — дзейсныя выканаўцы ўказанняў...

Чыжоўская сямейная Куцця ☞ 3

Аляксей МАРОЗ

Ужо пяты раз была наладжана гімназістамі, бацькамі і настаўнікамі Комплексу школ у Чыжах Куцця.

— Школа павінна быць другім домам і вялікай сям'ёй. Куцця ўводзіць нас у сямейную атмасферу. Кожная вясковая школа спалучана з вясковым асяроддзем і таму павінна знаёміць з народнымі абрадамі, — заявіў дырэктар школы Міраслаў Пяткевіч, які адкрываў мерапрыемства і вітаў гасцей...

Як святкавалі беластачане ☞ 4

Ганна КАНДРАЦЮК

Дзень да праваслаўных Каляд, у беластоцкай „чацвёрцы" спявалі беларускія калядкі, частаваліся куццёй і абменьваліся святочнымі пажаданнямі. На „Калядныя сустрэчы", якія падрыхтавала настаўніца беларускай мовы Аліна Ваўранюк, прыйшло за паўсотні людзей: у асноўным школьнікі і гімназісты з бацькамі ды выхавацелькі беларускіх класаў...

Палескі клін ☞ 8

Яўген МІРАНОВІЧ

Дыскусія ішла не ў справе асімілявацьці не асімілявацьці беларускае і ўкраінскае насельніцтва, а толькі якімі метадамі прывесці мясцовае грамадства да польскай нацыянальнай супольнасці. На фоне шматлікіх планаў і прапаноў наконт інтэграцыі ўсходніх ваяводстваў арыгінальнасцю вылучаўся праект палескага ваяводы Станіслава Даўнаровіча...

Беларускія моманты ў „Картках" ☞ 9

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Не першы раз у гэтым нерэгулярна паказваючымся ў Беластоку, з агульнапольскім абсягам, літаратурна-мастацкім часопісе, належнае месца прысвечана творчасці, публіцыстыцы і асобам звязаным з беларускім асяроддзем. У размове „Wszystko przez «Ulissesa»" Пятра Брысача і галоўнага рэдактара часопіса Багдана Дудко Ян Максімюк прызнаецца...

Утрымаць ліцэй

Размова з Уладзімірам КОЛАСАМ, дырэктарам Мінскага Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа, які 25 чэрвеня 2003 г. быў ліквідаваны адміністрацыяй Аляксандра Лукашэнкі.

Уладзімір Колас

— Спадар дырэктар, як гэта так? Ліцэй не існуе, а я бачу вучняў, настаўнікаў, вядуцца ўрокі... Вы прыехалі ўсёй групай у Вільню.

— Гэта праўда, мы ўвесь час працуем. Можа трохі неафіцыйна, быццам у падполлі, але ўсё ж такі. Працэс навучання праходзіць нармальна, нашу праграму выконваем паводле плана, поўнасцю, хаця ў больш складаных умовах. Нягледзячы на ліквідацыю школы ўладамі і прэсінг з боку ўлад на вучняў і бацькоў, у школе засталося 120 вучняў з агульнага ліку 150. Гэта паказвае, што толькі невялікая група бацькоў нашых дзяцей пабаялася шантажу ўлад або вырашыла, што пасыланне дзяцей у нефармальную школу — рызыкоўная справа. Гэта радуе нас, бо гэта доказ таму, якую пазіцыю выпрацаваў у апошніх гадах наш ліцэй, які ён патрэбны і ў якой ступені вучні і бацькі гатовы рызыкаваць у яго абароне. Вядома, што наша супраціўленне мае служыць не толькі нам, але ўсім тым, якія разумеюць сэнс слоў свабода, незалежнасць, годнасць. За такія справы варта змагацца.

— Якія, на Вашу думку, былі прычыны ліквідацыі школы? Ці гэта сталася раптам, ці канфлікт паміж ліцэем і ўладамі мае сваю гісторыю?

— Пачыналі мы ў 1989 г. як нядзельная школка, але пасля году тадышняе Міністэрства адукацыі прапанавала нам стварыць сапраўдны ліцэй. Тады ў адукацыйнай сістэме адбываліся цікавыя змены, а міністэрствам кіравалі маладыя, адукаваныя, адкрытыя на свет людзі. Іх мэтай была беларусізацыя асветы, вызваленне яе з-пад таталітарнага менталітэту, камуністычнага спосабу мышлення. Таму яны падтрымоўвалі такія ініцыятывы, як нашая, якія засяроджваліся на распрацоўцы новых праграм заняткаў, падручнікаў. Праблемы з'явіліся з прыходам да ўлады Аляксандра Лукашэнкі. Ужо ў жніўні 1994 г. выдаў ён распараджэнне аб выводзе са школ падручнікаў выдадзеных пасля 1991 г. Гэта перш за ўсё датычыла падручнікаў па гісторыі, літаратуры, беларускай мове. Міністэрства гэтае распараджэнне не выканала, бо неўзабаве пачынаўся новы школьны год і дзеці ўвогуле засталіся б без падручнікаў. Старыя падручнікі на практыцы выйшлі ўжо з абарачэння. У адказ Лукашэнка вызваліў з пасад двух віцэ-міністраў. Нашы праблемы абвастрыліся ў 1997 г., калі прэзідэнцкая адміністрацыя вырашыла забраць у нас будынак. Гэта нас узбударажыла і мы сталі супраціўляцца, арганізаваць акцыі пратэсту і пікеты. Дасягнуты кампраміс заключаўся ў тым, што права на ўласнасць будынка перайшло на адміністрацыю, а мы атрымалі права на бясплатную арэнду. Год пазней была зроблена спроба аб'яднаць нас з іншым ліцэем і стварыць навучальную установу, якая супрацоўнічала б з Педагагічным універсітэтам. Мы не хацелі на гэта згадзіцца, бо баяліся, што ў такой структуры мы не будзем мець рашаючага голасу і нашы каштоўнасці растворацца. Прыйшоў чарговы кампраміс. Міністэрства згадзілася пакінуць ліцэй у ранейшай форме, а мяне дэградавалі да функцыі віцэ-дырэктара. Пры тым пасада дырэктара заўсёды заставалася б вакантнай.

— Аднак тады можна было неяк дамаўляцца...

— Калісь так, сёння ўжо не. Ужо тады кампраміс даваўся штораз цяжэй. Памятаю, што тадышняя наша опцыя выглядала так: неяк датрываць да прэзідэнцкіх выбараў 2001 г., а тады можа штосьці памяняецца. Аднак, калі выбары адбыліся ў такі спосаб як адбыліся, нам стала ясна, што хутчэй ці пазней прыйдзе нам канец.

— Сталася гэта ў чэрвені 2003 года...

— Так, у гэты раз міністэрства вырашыла расправіцца з намі канчаткова. Перыяд кампрамісаў скончыўся, тым больш што мы заключалі іх некалькі гадоў раней з зусім іншымі людзьмі. На пасадзе дырэктара я перажыў чатырох міністраў адукацыі. Паралельна адбываліся кадравыя змены сярод чыноўнікаў ніжэйшых узроўняў. Тыя, што прыйшлі ў міністэрства ў апошні перыяд, не маюць маральных бар'ераў, яны — дзейсныя выканаўцы ўказанняў. Для іх, напрыклад, не мае значэння факт, што справа тычыцца дзяцей, што трэба было б дзейнічаць далікатна, двойчы падумаць, каб нічога не папсаваць. Яны не звяртаюць увагі на тое, што людзі маюць нейкія правы, што ўлада павінна забяспечваць патрэбы грамадзян, між іншым, іх адукацыйныя патрэбы. Мне здаецца, што тыя, у каго рашаючы голас, зацікаўлены ў ініцыяванні падобных канфліктаў, каб паказацца, заслужыць пахвалы, утрымацца на пасадзе, а можа і атрымаць павышэнне. Таму гэтым разам у нас не было ніякіх шанцаў.

— Прызначана была дырэктарка школы...

— Сам не ведаю, ці была гэта праява крайняга глупства, ці добра прыдуманай правакацыі. Гэта была найгоршая кандыдатура з магчымых. Не ведала яна беларускай мовы і вельмі любіла гэтым афішавацца, праяўляла варожасць, была несімпатычная і не скрывала мэты свайго прыходу. Яна хацела памяняць усё, зрабіць наш ліцэй такой жа ідэалагізаванай школкай, якіх у Беларусі сотні. Мы не маглі яе акцэптаваць, бо ведалі што яна сабой прадстаўляе і з якой мэтай прыйшла да нас. У выніку гэтага канфлікту ліцэй ліквідавалі.

— Як выглядае праца школы, якой няма?

— Намагаемся, каб усё адбывалася па меры нармальна. Заняткі пачаліся тэрмінова, 1 верасня і некалькі дзён вяліся пад адкрытым небам, паблізу стадыёна „Дынама". Пазней прытулілі нас арганізацыі, з якімі мы дружым, але з іх памяшканняў прагнала нас міліцыя. З таго часу заняткі вядзем у 11 прыватных кватэрах у Мінску, нанятых на патрэбы школы. Цяпер у нас няма праблем з будынкам, якім мы карысталіся больш за дзесяць гадоў без сродкаў на рамонт, няма аварый, пастаянных інспекцый, затое з'явіліся праблемы з грашыма, з зарплатнымі фондамі, з арэндай памяшканняў. Многа дапамагаюць нам бацькі вучняў, а таксама беларуская дыяспара з ЗША і Еўропы. Мы вельмі ўдзячны Літве за магчымасць пабыўкі ў Вільні на працягу двухтыднёвага святочнага перапынку. Дзякуючы таму нашы дзеці маглі вучыцца ў нармальных умовах, з доступам да хімічнай і фізічнай лабараторый, спартыўнай залы, камп'ютэрнай майстэрні. Апрача таго ад паўгода мы ўпершыню сабраліся ўсе разам. Гэта вельмі моцна падмацоўвае нас духова і эмацыянальна. Такія перыяды нам усім вельмі патрэбныя.

— Якая, на Вашу думку, будучыня Ліцэя імя Якуба Коласа?

— Спакойнага жыцця ў нас ужо не будзе, хіба што ў Беларусі адбудуцца карэнныя змены. Калі зменіцца, будзе добра, значна лепш, калі не — чакае нас надта складаная будучыня. Адно пэўнае — ліцэй трэба ўтрымаць. Спрабуем школу зарэгістраваць нанава, прыдбаць ёй будынак. Збіраем на гэта сродкі. Важным будзе момант, калі вясною нашы матурысты прыступяць да экзаменаў. Закон дазваляе здаваць экзамены экстэрністычным спосабам. Аднак ці нашым вучням улады гэтага не забароняць, як да іх потым паставяцца экзаменацыйныя камісіі на ВНУ? Мабыць, прыйдзецца арганізаваць вучням экзамены за мяжой, можа ў Літве, або Польшчы? Дайшла да нас вестка з Чэхіі, што сем нашых вучняў атрымае стыпендыі на тамашніх ВНУ. Гэта вельмі важная падтрымка. Спадзяюся, што да гэтай акцыі далучацца іншыя краіны. Мы ж толькі хочам вучыць нашых дзяцей. У нашых дзеяннях няма нічога дрэннага. Цепліцца надзея, што тыя, якія давялі да такой сітуацыі, перадумаюць справу. Можа чыноўнікі, дэпутаты пашукаюць адказу на пытанне як гэта дзеецца, што здольныя дзеці непатрэбныя Беларусі, а патрэбныя Літве? Таксама грамадства павінна задумацца над тым, што дзеецца ў краіне. Трэба паставіць сабе пытанне пра годнасць. У які спосаб не стацца падпарадкаванай без канца істотай, як бараніць сваю чалавечнасць. Гэта напэўна выканае сваё заданне. Так думаем.

Гутарыў Марцін РЭМБАЧ

Беларускі ліцэй: сорам і гонар

Гісторыя Беларускага нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа пэўна будзе ўпісана ў гісторыю развіцця беларускамоўнай адукацыі залатымі літарамі. І гэта абсалютна не залежыць ад далейшага развіцця падзей з навучальнай установай. Бо самае галоўнае — цвёрдасць духа, прага да свабоды самавыяўлення ды і проста жаданне „людзьмі звацца" — ужо праяўленыя на самым высокім узроўні. Настаўнікі, вучні і іх бацькі вартыя таго, каб быць узнагароджанымі самымі рознымі ордэнамі і медалямі. А саму гісторыю існавання ліцэя можна акрэсліць як гераічную.

У новай навучальнай сярэдняй спецыяльнай установе існавалі два падрыхтоўчыя курсы і два наступныя ўласналіцэйскія, дзе навучаліся падлеткі ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў. А ў Мінску яму быў афіцыйна перададзены будынак па вуліцы Кірава, 21 — выдатная пабудова XIX стагоддзя з высокай столлю і шырокімі сценамі. Але час ішоў. Перыяд пасляперабудовачнай беларусізацыі першай паловы 90-х гадоў скончыўся і хутка для ліцэя распачаліся праблемы. У 1997 годзе гэты самы будынак спрабавалі адняць, а пазней сам ліцэй перавесці пад юрысдыкцыю Белдзяржпедуніверсітэта. Навучэнцы і іх бацькі збіралі подпісы супраць гэтага, звярталіся да розных устаноў з патрабаваннямі і просьбамі пакінуць ліцэй у спакоі. Тым разам гэта дапамагло. Але праз год у сувязі са своеасаблівай рэарганізацыяй быў вымушаны пайсці са сваёй пасады Уладзімір Колас. Ліцэй пры цэнтры стаў насіць існаваўшую да мінулага году назву Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа. Былога дырэктара прызначылі намеснікам, але фактычна ён застаўся кіраўніком установы. Такім стаўся часовы кампраміс з мацнеючай барацьбой супраць беларускасці. Але акрэсленая і актыўная грамадзянская пазіцыя кіраўніцтва і выкладчыкаў працягвала выклікаць незадаволенасць правячай улады, якая цяпер змагаецца з „гнёздамі апазіцыі" ў сістэме адукацыі. І ліцэй з дапамогай атрада міліцыі асаблівага прызначэння разагналі. Пры гэтым не зважаючы ні на думку вучняў, бацькоў і саміх настаўнікаў-стваральнікаў установы. Не зважаючы на амаль стопрацэнтнае паступленне выпускнікоў ліцэя ў ВНУ, не зважаючы на ўсясветнае прызнанне высокай якасці навучання ў ім. Бо тое навучанне вялося на беларускай мове, а ці можна на ёй выказаць разумную думку?! Для гэтага, здаецца, існуюць толькі руская і англійская. Такое меркаванне калісьці прагучала з вуснаў цяперашняга кіраўніцтва краіны.

Пачынаючы з верасня ліцэісты, якіх больш за сотню, вучацца дзе прыйдзецца. Спачатку навучанне было на вуліцы, потым у розных канцах беларускай сталіцы. Калядныя канікулы вучні правялі ў Літве, дзе змаглі пазаймацца ў адпаведна прыстасаваных умовах Віленскага ліцэя.

Сёння змагары за Беларускі ліцэй зноў у Мінску і зноў у сваёй барацьбе за права вучыцца па-беларуску ў Беларусі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Чыжоўская сямейная Куцця

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Да вячэры рыхтаваліся маці з нявесткай (злева) Паўліна Яканюк і Эвеліна Таранта

Ужо пяты раз была наладжана гімназістамі, бацькамі і настаўнікамі Комплексу школ у Чыжах Куцця, што стала малым юбілеем. У радасны настрой свят Ражджаства Хрыстовага ўвялі святочная малітва, якую заспявалі айцец Іаан Раманчук і айцец Марк Якімюк, і калядкі ў выкананні ўдзельнікаў сустрэчы. На сёлетняе спатканне, якое наладжанае было 3 студзеня, прыбылі старшыня Рады Чыжоўскай гміны Валянціна Якімюк і гмінны сакратар Марыя Ляшкевіч.

Куцця пачалася з падрыхтоўкі да вячэры. Гімназісткі Паўліна Яканюк і Эвеліна Таранта рыхтавалі мак для куцці і іншыя стравы, якімі заставілі стол дзеда і заадно гаспадара вячэры. Выступленне вучняў мела абрадавы характар. У мінулым людзі верылі, што іх паводзіны перад святамі Нараджэння Хрыстовага будуць мець уплыў на жыццё ў новым годзе і таму гімназісты ўключылі ў свае сцэнкі народныя павер'і, якія зараз лічаць „забабонамі". Маці з нявесткай спраўджалі, ці не патрэскалі ў печы зярняты куцці, што прадвяшчала ўдалы год. Калі суседка, якую іграла настаўніца беларускай мовы Вера Флярчук, прыйшла пазычыць мак, то гаспадыня адмовілася. Верыла, што на Куццю нельга нічога пазычаць, бо пасля не будзе ставаць у доме прадуктаў.

— Школа павінна быць другім домам і вялікай сям'ёй. Куцця ўводзіць нас у сямейную атмасферу. Кожная вясковая школа спалучана з вясковым асяроддзем і таму павінна знаёміць з народнымі абрадамі, — заявіў дырэктар школы Міраслаў Пяткевіч, які адкрываў мерапрыемства і вітаў гасцей.

Усё згодна з традыцыяй

Вячэра, да якой запрашаў згодна з традыцыяй дзед, пачалася з просвіраў, прынесеных з царквы. Пасля сабраныя елі грыбны боршч са свойскім хлебам, рыбныя стравы, марынаваныя селядцы, некалькі відаў салатаў і многа іншых страваў, якія падрыхтавалі мамы гімназістаў і настаўніцы. У прыкуску былі напіткі і клёцкі з макам. За галоўным сталом побач дзеда (пасярэдзіне) сядзелі яго сын і ўнук. За імі, у святым кутку, вісела ікона Ражджаства Хрыстовага і гарэлі каля яе свечкі, што абвяшчалі хуткае прыбліжэнне святаў. Напіткам, якім угашчаў сабраных дзед, быў мёд. Згодна з традыцыяй пілі яго з аднаго кілішка і закусвалі поснай стравай. За вячэрай моладзь, настаўнікі і запрошаныя госці спявалі калядкі. У хату заходзілі калядніки, якіх запрашалі за стол і ўгашчалі. У гэтым годзе калядавалі „Збучанкі" і моладзь з Чыжоў. Побач вучняў з падставовай школы прыйшлі выпускнікі гімназіі, якія крыху сумуюць па сваёй школе.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У святым кутку селі (злева) Андрэй Раманюк, Аркадзь Антаноўскі і Павел Тапалеўскі

Настаўніцкая заангажаванасць

Пра вясковыя звычаі калядавання і наладжвання Куцці расказвала настаўніца Вера Флярчук, якая разам з іншымі настаўніцамі беларускай мовы — Аннай Лаеўскай і Валянцінай Андрасюк наглядалі за мерапрыемствам. Памагалі ім усе іншыя настаўнікі. Вера Флярчук штогод рыхтуе сцэнарый Куцці і клапоціцца, каб была захаваная вясковая традыцыя. Яна напамінала, што згодна з вясковым звычаем, трэба прынамсі раз спрабаваць усе стравы. Аднак удзельнікаў вячэры не трэба было дадаткова заахвочваць, бо ўсе стравы былі смачнымі.

У час вячэры часта паўтараліся словы калядкі і каляда, якія моцна замацаваліся ў беларускай традыцыі. Хаця на Беласточчыне свята Нараджэння Хрыстовага называюць „Руздвом", то Куцця атрымала названне Каляда. Паводле доследаў можна меркаваць, што гэтае слова выводзіцца ад названня паганскага бога Каляды, якому прыпарадкоўвалася адказнасць за святы і мір, а святкаванні ў яго гонар адбываліся ў перыядзе сённяшніх святаў Раства Хрыстовага. Пасля словам Каляды сталі народна называць перыяд ад Хрыстовага Раства да Богаяўлення. Дзень перад святкаваннямі Нараджэння Хрыстовага атрымаў названне Куцця, бо ў час урачыстай вячэры, да якой праваслаўныя вернікі рыхтаваліся ў шчырым посце (ад раніцы нічога не елі і не пілі), апошняй стравай была куцця.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Анна Лаеўская і Вера Флярчук

— Куццю арганізуем у нашай школе з 1999 года, у рамках рэалізавання рэгіянальнай сцежкі. Гімназісты-першакласнікі мяняюцца, але прыходзяць тыя самыя настаўнікі і многія тыя ж самыя ганаровыя госці і таму стараемся, каб кожны год святкаванне мела іншы выгляд. З кожным годам мяняюцца неспадзяваныя госці, якімі з'яўляюцца калектывы з Чыжоўскай гміны, — сказала настаўніца Вера Флярчук.

Вучні атрымалі ў канцы спаткання святочныя падарункі. Разам з настаўнікамі і гасцямі разыходзіліся з мерапрыемства ў радасным настроі, размышляючы аб святкаваннях Нараджэння Хрыстовага.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

За другім сталом сядзелі госці і настаўнікі

Каляда з надзеяй

„Зерне, кінутае ў зямлю, узыходзіць ды красуе. Не загіне край наш родны, пакуль жывуць людзі". Большменш такія словы ў пачатку XX стагоддзя напісаў Янка Купала.

Факт, што ад пяці гадоў у Чыжоўскай школе вучні, бацькі і настаўнікі супольна ладзяць Куццю — гэта станоўчы прыклад інтэграцыі вясковашкольнага асяроддзя. Але, калі гэты абавязак быць са сваім народам разумеюць мясцовыя святары і гмінныя ўлады, — дык захаванне беларускасці сярод маладых жыхароў гміны прынясе плён у будучыні. І вось, калі ў гміне пануе спрыяльная беларускасці атмасфера, то няма чаму здзіўляцца, што 81,81% усіх жыхароў гміны, гэта значыць 2 280 асоб, назвала сябе ў час перапісу насельніцтва беларусамі — працэнтна найбольш з усіх беларускіх гмін. Дзякуй Вам за гэта, жыхары Чыжоўскай гміны!

Яўген Вапа

Як святкавалі беластачане

Дзень да праваслаўных Каляд, у беластоцкай „чацвёрцы" спявалі беларускія калядкі, частаваліся куццёй і абменьваліся святочнымі пажаданнямі. На „Калядныя сустрэчы", якія падрыхтавала настаўніца беларускай мовы **Аліна Ваўранюк**, прыйшло за паўсотні людзей: у асноўным школьнікі і гімназісты з бацькамі ды выхавацелькі беларускіх класаў.

— Як святкуюць беластачане? — папыталі мы бацькоў школьнікаў:

Альжбета Врублеўская:

— На Куццю едзем у Дэніскі да цесцяў — Анны і Васіля Врублеўскіх. Куцця ў нас традыцыйная, святкуем у сямейным крузе. Пасля вячэры, часам, ідзем у царкву.

Першы дзень *Руздва* святкуем у маіх бацькоў, у Ірэны і Аляксандра Цішукоў у Райску. Сын Мар'юш ходзіць калядаваць разам з мясцовымі дзецьмі. Пасля абеду ідзем да маіх бабулі і дзеда.

— У Мар'юша ёсць прабабка і прадзед?

— Так, у Райску жывуць мая бабуля і дзед — Вольга і Мікалай Чэрвінскія, і заўсёды да іх заходзім.

— Колькі дзён святкуеце?

На трэці дзень вяртаемся ў Беласток і тут святкуем. Не ходзім на працу.

Міраслаў Рудчык:

— Паедзем да цесцяў — Анны і Мікалая Екацярынчыкаў у Бельск. Пасля вячэры ідзем у царкву (хаця не заўсёды выстойваем да канца). На першы дзень прыходзяць дзеці і наша дачка Наталька разам калядуе. Свята праводзім у сямейным крузе.

Дзеда Мароза ў нас не ведаюць, з падарункамі прыходзіць святы Мікалай.

Ірэна Стэльмашчук:

— Наша сям'я жыве ў Беластоку і на Куццю ідзем да маіх цесцяў Анны і Мікалая Стэльмашукоў. Калядную вячэру пачынаем малітвай і просвірай, пасля, за сталом спяваем калядкі. Сярод калядных страў на стале фаршыраваны карп. Спосаб ад маёй бабулі, якая калісьці працавала ў яўрэяў і адтуль рэцэпт. Пасля вячэры ідзем у царкву.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Калядная сустрэча бацькоў і дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ірэна Стэльмашук, Аліна Ваўранюк, Альжбета Врублеўская з сынам Марыюшам

Святы ў нас экуменічныя, на другі дзень у госці прыходзіць сяброўка-каталічка (у якой мы былі на каталіцкія святы).

— А як святкуюць вашы дзеці — Ася, Пятрусь і Міхась?

— У нас ёсць гвязда, у мінулым годзе Ася хадзіла калядаваць.

— Калі ставіце ёлку?

— Вядома, на нашу Куццю.

Аліна Ваўранюк:

— Звычайна, Куццю спажываем у цесцяў, у Тыневічах, аднак у гэты раз едзем у Бельск да маіх бацькоў — Раісы і Сцяпана Бурылаў. Разам з намі будзе мая бабуля Люба. Застолле ў нас традыцыйнае, дванаццаць страў, месца для нечаканага госця. Пасля вячэры спяваем калядкі. На другі дзень свята паедзем да цесцяў — Марыі і Уладзіміра Ваўранюкоў, пасля абеду паедзем у Чыжы. Ёсць адна праблема — наш сын Аляксандар хоча святкаваць у Тыневічах, а дачка Ніна ў Чыжах, каб калядаваць са сваячкамі.

Валя Ласўская:

— Святкуем у Беластоку. Традыцыйна, тры дні. Наша свята будзе мець экуменічны характар, да нас прыйдуць госці — каталікі і евангелікі. Прыйдзе мая сястра з сям'ёй, у якой мы гасцявалі на каталіцкія святы.

Святы Мікалай прыходзіць ноччу і пакідае падаркі пад ёлкай.

— А калядніки будуць?

— Я запрасіла тых што прыходзілі на каталіцкія святы. Як прыдуць — мы будзем рады!

Ганна Кандрацюк

Каб радаваліся іншыя

У вольны ад вучобы дзень сустракаю ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы гімназістаў з настаўніцамі-бібліятэкарамі Ірэнай Ігнатовіч і Галінай Іванюк. У чытальнай зале вучні завіхаюцца сярод ласункаў, прадуктаў і цацак. Якраз рыхтуюць яны падарункі для дзяцей з бедных сем'яў і старэйшых адзінокіх асоб. Трэба ўсё дакладна размеркаваць у больш за 120 пакетаў. Валанцёры з гайнаўскай белгімназіі рашыліся дзейнічаць у камандзе святога Мікалая, якая арганізавалася пад патранатам „Газеты выбарчай".

— Мы звярнуліся да каардынатараў дапамогі за згодай на арганізаванне яе перад праваслаўнымі святамі Раждзяства Хрыстовага і атрымалі дазвол, — кажа настаўніца Ірэна Ігнатовіч. — Аднак пакуль раздаваць падарункі, мы мусілі многа папрацаваць.

Ужо ў лістападзе валанцёры з белгімназіі звярнуліся да кіраўнікоў магазінаў за дазволам на арганізаванне ў іх збору прадуктаў. Кошыкі на ласункі, цацкі і іншыя прадукты расставілі ў 14 магазінах ПСС „Сполэм" і 2 магазінах „Архелян". Людзі, якія рабілі пакупкі, укідалі туды прадукты харчавання і некаторыя рэчавыя прадметы. Валанцёры сабралі такім спосабам 70 кілаграмаў мукі, 50 кілаграмаў цукру, рыс, макароны, 185 шакаладаў і прадметы штодзённага карыстання. Грошы сабіралі ў скарбонкі. Каля 450 злотых сабралі ад вучняў, настаўнікаў і публікі ў час школьных матчаў. Па 70 злотых атрымалі ад магазіна „Архелян" і прыватнага спонсара. За сабраныя грошы куплялі найчасцей цацкі, школьныя прылады і прадметы штодзённага карыстання. Адрасы патрабуючых дапамогі атрымалі ад працаўнікоў сацыяльнай дапамогі, праваслаўных прыходаў і школьнага педагога.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Валанцёры і настаўніцы (справа) Галіна Іванюк і Ірэна Ігнатовіч

— Мы рашыліся наведаць тыя сем'і, дзе дзецям цяжка разлічваць на атрыманне ад бацькоў ласункаў або цацак. Стараліся купіць такія прадметы, якія найбольш узрадуюць наймалодшых, — гаворыць Галіна Іванюк. — У падарункі дакладалі прадукты харчавання і прадметы штодзённага карыстання, якія змогуць выкарыстаць сямейнікі дзяцей. Навучыцца спачуваць патрабуючым. Гімназісты і іх настаўніцы не забылі таксама пра старэйшых адзінокіх асоб. Некаторых людзей вучні наведваюць пастаянна ў рамках валанцёрскай работы. Ужо звыш года гайнаўскія белгімназісты заходзяць у Дом міласэрнасці „Самаранін" і да асоб, якія патрабуюць дапамогі. У доме „Самаранін" многа старэйшых людзей, якім патрэбна звычайная размова. Вучні робяць ім пакупкі і прыбіраюць у пакоях. Нядаўна прынеслі старэйшым жанчынам ёлку і ўпрыгожылі яе.

— Валанцёрскай работай гімназісты вучацца спачуваць патрабуючым. Бачу, што яны моцна ангажуюцца ў сваю работу, — заяўляе Ірэна Ігнатовіч. — Аднак не было б такой дапамогі без збору прадуктаў у магазінах „Архелян", ПСС „Сполэм" і грашовых ахвяраванняў прыватных асоб, якім шчыра дзякуем.

Валанцёры з белгімназіі наведваюць таксама вучняў з Комплексу спецыяльных школ, якім дапамагаюць арганізаваць школьныя мерапрыемствы.

— Мы любім памагаць людзям і цешымся, калі іншыя радуюцца. Нам прыкра глядзець на старэйшых асоб, якія з вялікімі цяжкасцямі робяць пакупкі ў магазінах, — кажуць Паўліна Скепка і Эмілія Амельянюк, якія па некалькі разоў у тыдзень наведваюць 93-гадовую бабулю Надзю. Купляюць ёй прадукты харчавання і прыносяць воду. Найбольш работы было ў час сабірання прадуктаў з магазінаў. Радавалі іх сустрэчы з патрабуючымі дапамогі. Гімназісты разам са святым Мікалаем і настаўніцамі заходзілі да бедных сем'яў, уручалі дзецям святочныя падарункі і віншавалі са святамі Раждзяства Хрыстовага. Вучні заехалі да бабулі Олі, якую раней наведвалі. Павіншавалі і ўручылі сувеніры невідучай асобе. На машыне заязджалі ў Новае Корніна, Арэшкава, Васількова, Катоўку, Рэпіскі, Новае Беразова і Смаляны Садок.

Аляксей Мароз

Уражанні Жанны Аўдзеевай

Са Слуцка на Бельшчыну

У рамках праекта, арганізаванага Беларускім самаўрадавым форумам у Рэспубліцы Польшча сумесна з грамадскім аб'яднаннем „Фонд імя Льва Сапегі", беларуская дэлегацыя наведала Бельскі павет. У яе складзе была і Жанна Аўдзеева, прадстаўніца слуцкай газеты „Кур'ер".

Прафсаюзнікі ў Бельску на адкрыцці выстаўкі беларускай графікі ў размове з паслом Беларусі Паўлам Латушкам (справа). Жанна Аўдзеева — у цэнтры.

Фота МІРЫ ЛУКІЦІЧ

Сацыяльныя праблемы

Падчас візіту наша дэлегацыя наведала некалькі бельскіх устаноў, падобных на тыя, якія ёсць і ў Слуцку. Я як карэспандэнт „Кур'ера" пазнаёмлю сваіх чытачоў з практыкай дзейнасці гэтых устаноў у нашых заходніх суседзяў. Напрыклад, Дом дапамогі, установа ў нейкім сэнсе родная сястра нашага дома састарэлых. Падчас нашага візіту ішла дыскатэка. Удзел у ёй прымалі каля пяцідзесяці чалавек — і састарэлыя, і інваліды на калясках. На вальсы ды полькі запрашалі ўсе і ўсіх: мужчыны жанчын і наадварот. Танцавалі нават і тыя, хто сядзіць у калясцы. Карагод з такіх танцораў вельмі ўражваў.

Наша дэлегацыя пабывала ва Управе працы. Як тлумачылі прадстаўнікам беларускай дэлегацыі ва Управе працы, дзейнасць установы па дапамозе беспрацоўным датычыцца не толькі пошукаў працы сваім кліентам. Супрацоўнікі Управы сістэматычна праводзяць семінары з удзелам беспрацоўных, арганізуюць курсы перакваліфікацыі, ствараюць новыя працоўныя месцы.

Дарогі да сваёй малой радзімы

Дэлегацыя завітала і ў Бельскі дом культуры.

— Адразу ж пачну з таго, што дырэктар Бельскага Дома культуры — беларус, Сяргей Лукашук. З гэтай нагоды, мабыць, прыкметна і яго прыхільнасць да беларускасці. Развітваючыся дырэктар Дома культуры падарыў кожнаму з дэлегатаў па аўдыёкасеце з запісам гурту беларускай народнай песні „Маланка". Паслухалі — добра спяваюць на беларускай мове ў Польшчы! Пабывалі мы таксама ў вёсцы Студзіводы ў музеі Дарафея Фіёніка, які быў нашым перакладчыкам і гідам. Калі пераступаеш парог гэтай хаціны, адчуваеш, што нібыта апынуўся ў сялянскай хаце пачатку мінулага веку. Пачаставалі нас Дарафей і яго жонка булкамі з молатай у жорнах мукі, а іх трохгадовы сын Максім здзівіў усіх прысутных сваёй дзіцячай гамонкай па-беларуску.

Маўкліва сядзелі мы ў гэтай хаце і слухалі, як у печцы пастрэльваюць дровы, і кожны, мабыць, успамінаў сваіх бабуль і дзядуль, свае карані. Думалі і пра тое, што ўжо не маем такой магчымасці — прачнуцца з першым пеўнем, пачуць пах свежага хлеба з печкі, глынуць цёплага малака з гладыша. Дарогі да сваёй малой радзімы амаль згублены.

Можа таму з нейкай зайздрасцю і невыказанай павагай мы развіталіся з Дарафеем і Эляй, якія захавалі для сябе і сваіх нашчадкаў тое, што ў жыццёвай кругаверці вельмі лёгка згубіць і ўжо ніколі не вярнуць.

Сядуць утрох і будуць у карты гуляць

— Былі мы ў фірме «Максбуд». Замацавацца на гэтай фірме лічыцца ў Бельску вялікім поспехам у жыцці. Продкі дырэктара фірмы Яна Менюка — беларусы. Таму і ён размаўляў з дэлегацыяй на зразумелай добрай беларускай мове. Распавядаў ён аб сваім прадпрыемстве, як аб любым дзіцяці. Пятнаццаць гадоў назад ён стварыў гэту фірму, і столькі ж гадоў з'яўляецца яе галоўным акцыянерам і дырэктарам. Увесь прыбытак, па яго словах, укладваецца ў развіццё вытворчасці, а гэта звыш мільёна долараў у год. Асноўным заказчыкам фірмы з'яўляецца дзяржава. Яна лічыцца ў вытворчых колах, як самы надзейны плацельшчык. Залогам поспеху пан Ян лічыць рызыку. „У бізнесе хто не рызыкуе, — казаў ён, — той і не мае. Калі не рызыкаваць, то ўсё жыццё будзеце ездзіць не на „Мерседэсе", а на „Масквічы". Але ж, на мой погляд, поспех „Максбуда" не толькі ў рызыкоўнасці кіраўніка. Вельмі значнае месца ў дасягненні поспеху займаюць адносіны дырэктара да працаўнікоў. З усіх выплат у першую чаргу пан Ян выплачвае заробак людзям. Пан Ян, да ўсяго сказанага, яшчэ з'яўляецца вядомым сваёй дабрачыннасцю чалавекам. Ён дапамагае царкве, дзіцячым садкам, шпіталям, бедным. У мінулым годзе кіраўнік „Максбуда" накіраваў тысячу навагодніх падарункаў у Беларусь — дзецям Слонімскага раёна. За ўсе добрыя справы пан Ян Менюк быў узнагароджаны ордэнам Святой Магдаліны. Яшчэ запомніўся нам кіраўнік „Максбуда" як чалавек з добрым гумарам. Калі мы яго запыталі, колькі прыбіральшчыкаў наводзяць такую чысціню, ён адказаў: „А ў мяне вымятае ўсю тэрыторыю адзін начны вартаўнік. Мяце ўсю ноч. Выгода відавочная. Чалавек не спіць, тэхніку сцеражэ, яшчэ і чысціню наводзіць. А вазьмі ж вартаўніка, прыбіральшчыка, садоўніка, дык яны сядуць утрох і будуць толькі ў карты гуляць".

Выслухала (лук)

Вачыма паляка

Навагоднія пробліскі

Студзень гэта месяц, калі мы плануем, марым і няраз прарочым, што можа нас сустрэць на працягу года. Першае навагодняе прадказанне я пачуў у Тэлебачанні Беласток. Адна варожка-тарацістка прадказала, што ў першай палове года ў рэгіёне і ў Польшчы не будзе лёгка жыць. Найгорш мае быць на пераломе траўня і чэрвеня (ці не ў выніку ўваходу ў ЕС?). Пералом мае наступіць недзе каля жніўня. Што асабліва цікавае, пані варожка вычытала ў картах тарота, што Польшчу, а асабліва наш рэгіён, чакаюць праблемы, як акрэсліла, з польска-беларускай мяжой. Паўтарала гэта разы тры. У чым канкрэтна справа, карты ёй не адкрылі.

На большым сур'ёзе я спрабаваў учытацца ў навагоднія прароцтвы членаў управы Падляшскага ваяводства, старшыні сейміка і генеральнай дырэктаркі Маршалкоўскай управы, апублікаваныя на інтэрнэтавых старонках установы. Некаторыя прыцягнулі маю асаблівую ўвагу.

— 2004 год будзе годам матэрыяльных дасягненняў, — прадказаў маршалак Януш Кшыжэўскі. Пералічыў ён, між іншым, пабудову новых спартыўных аб'ектаў, ачышчальні сцёкаў, экалагічных установак, новых дарог. Хвала ды слава! Хай так і будзе. Толькі што ў значнай большасці гэтыя аб'екты фінансуюцца з гмінных бюджэтаў і цяжка тут гаварыць аб матэрыяльных дасягненнях самаўрадавай ваяводскай улады. Пры нагодзе пан маршалак хваліцца паніжэннем на канец мінулага года беспрацоўя ў рэгіёне. Як падкрэсліў, паменшылася яно з 92 тыс. да 78 тыс. Але ці напэўна? А, можа, частка беспрацоўных выйшла з уліку Установы працы, бо, зарабіўшы нават адну залатоўку, не мае права ні на ўспамогу, а нават і на страхоўку. Вядома, гэта толькі маё меркаванне, хоць у мяне на гэты конт ёсць свой досвед.

Больш „радасна" бачыць гэты год член управы па справах культуры і асветы Ян Сычэўскі. Прывяду ягонае выказванне дослоўна:

— Ёсць пробліскі, што, мабыць, у некаторых галінах, дзякуючы дапамозе ведамства, значыць, Міністэрства культуры, і з дапаможных сродкаў Еўрасаюза ўдасца сарганізаваць крыху больш і лепш.

У гэтым кантэксце ў выказванні Яна Сычэўскага паявілася Беластоцкая філармонія са святкаваннем 50-гадовага юбілею. Адно толькі, што да дзейнасці (юбілейнай) Філармоніі не зводзіцца культурнае жыццё ў рэгіёне, сярод гэтага — нацыянальных меншасцей. Таемныя пробліскі, якія маюць паўплываць на „больш і лепш", застаюцца таямніцай. Тлумачыць можна яе, а затым і апраўдваць у выпадку няўдачы, далейшае адкрыццё пана Сычэўскага:

— Управа Падляшскага ваяводства, і я асабіста таксама, прапаведвае такі прынцып, што ў адносінах да культуры трэба займаць такое становішча, каб не перашкаджаць. Знайсці таленавітых людзей, адкрывальнікаў, разумных, і не замінаць ім у творчай дзейнасці.

І далей:

— Тут наша палітыка спрычынілася да таго, што асяроддзі, звязаныя з культурнай дзейнасцю ў нашым ваяводстве знакаміта адны з аднымі дамаўляюцца.

Так, вось, ваяводскі самаўрад не намерваецца перашкаджаць. Але па прычыне недахопу грошай тое „перашкаджанне" фактычна не мае сэнсу, нават калі б гэта мела быць, аб чым калісьці марыў маршалак Кшыжэўскі, інспіраванне творчых і, шырэй, культурных асяроддзяў. Так ці іначай, пакуль што ў 2004 г. астаецца разлічваць на *porozumiewanie się jednych z drugimi*. А ваяводская ўлада, як разумею, зоймецца тым, што будзе прыглядацца і выглядаць пробліскаў.

Збігнеў Кшывіцкі, старшыня сейміка, у сваю чаргу прадказвае ўзнікненне таямнічых, як гэта называе, устаноў, інтэгруючых ваяводства ды выклікаючых інтэграцыю асяроддзя няўрадавых арганізацый. Да таго: назначэнне ганаровага грамадзянства тым, што „значаць шмат для ваяводства", устанаўленне рэгіянальнай адзнакі, узнагароджанне прадпрымальнікаў інвестуючых у культуру і спорт. Ой, гэтыя апошнія пункты папахваюць мне афёрамі. Самаўрадавая ўлада выбіраецца ж па палітычнаму ключу і маю адвагу сказаць, што ён будзе абавязваць пры ўшаноўванні і вылучанні гэтых, а не іншых заслужаных, неабавязкова не па непалітычных заслугах.

А калі ўжо гаворка аб прароцтвах зачапляючых, мабыць, за надыходзячы ў новым годзе скандал, дык я прапаную ўвайсці на інтэрнэтавую старонку Маршалкоўскай управы і пачытаць сабе заявы члена ўправы Кароля Тыленды, які, падобна як і маршалак, ганарыцца гэтым, што пусцілі ў рух *Wrota Podlasia*, інтэрнэтавы партал, які якраз у гэтым годзе мае „раскрунуцца". Тыленда сцвердзіў:

— Вялікі наш поспех — стварэнне *Варот Падляшша*, якія будуць моцным інструментам для Падляшскага ваяводства, не толькі прамацыйным, але таксама і для сярэдняга Кавальскага. У найбліжэйшы час партал будзе ўспамагаць кантакты насельніцтва з урадавай і самаўрадавай адміністрацыяй.

Як гучыць! А я пытаюся: хто будзе фінансаваць інтэрнэтавыя спалучэнні гмін у рамках *Варот Падляшша*, у кантэксце функцыянавання цыфравай установы? Грошы гэта немалыя, асабліва таму, што гміны пакутуюць іх недахопам і не стае ім іх на найважнейшыя патрэбы. Далей пытаюся: ці *Вароты Падляшша* гарантуюць тое, што мае быць іх сутнасцю, значыць, магчымасць карыстання чыноўніцкімі паслугамі ў сістэме он-лайн. Справа ў сутнасці гэтага партала, у доступе гэтым шляхам і шанцы запаўнення грамадзянамі такім спосабам рознага віду фармуляраў, напрыклад, дазволаў, занясення ва ўлікі гаспадарчай дзейнасці і да г.п. Ведаю ад знаёмага камп'ютэрнага спеца, што не! Пакуль што, *Вароты Падляшша* гэта інтэрнэтавыя лісточкі, на якія можна паглядзець і штосьці там пачытаць. Дарэчы, яны нейкія нескладныя, непразрыстыя графічна.

Яны, навагоднія мары, планы і прароцтвы такія, якім неабавязкова здзяйсняцца. У апошнія гады так і здараецца, у рэгіянальным ды агульнапольскім маштабе. Чаму не называць іх абяцаннямі? На заявы ваяводскіх улад, таксама як і прадказанні варожкі, глядзеў я прыжмурыўшы вока. Ну, як перажыць гэты цяжкі 2004 год? Прынамсі да жніўня, паводле гадалкі? Прыплюшчваючы вока?

Мацей Халадоўскі

Зорка

старонка для дзяцей

Радасць на Каляды!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Каляднікі з Ласінкі

— А адкуль вы, такія гожыя хлопцы, будзеце? — пытае бабуля першых калядоўшчыкаў з зоркай-гвяздай.

— Мы з Ласінкі!

Гаспадыня распазнала двух, ды пытае ў трэцяга:

— А чый ты будзеш?

Маладзён назваў сваё прозвішча, але яно нічога не паясніла бабулі.

— Я Сэбэсь! — кажа ўрэшце той і ўсе заліваюцца гучным смехам.

— To jakaś pełna konspiracja! — каментуе беластоцкі ўнучак бабулі, які не разумее смеху.

У вёсках пад Нарвай — усе ўсіх ведаюць. Аднак не па афіцыйных прозвішчах, толькі па-вулічнаму, па мянушках.

Веданне мясцовых звычаяў для калядоўшчыка каштоўнае, сваім заўсёды даюць больш грошай.

* * *

Яшчэ нядаўна ў кожнай хаце прымалі калядоўшчыкаў. Бедныя і багатыя з радасцю сустракалі святочных гасцей-спевакоў. Верылі, калі добрыя каляднікі прыйдуць — завітае ў хату шчасце. На полі вырасце збожжа, у хаце запануе дастатак і згода. Словам — грэх закрыць перад калядоўшчыкамі дзверы!

Нават там, дзе была жалоба і ў хаце нельга спяваць, выходзілі на

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Каляднікі з Дзіцячага дома ў Белавежы, разам дзеці з Катлоўкі

панадворак, давалі грошы і запрашалі праз год.

— І зараз усе дамы былі адкрыты, — кажа 12-гадовая калядоўшчыца Наталля.

Разам з чатырма сябрамі абышла чатыры вёскі — Ласінку, Кавелу, Навіны і Катлоўку. Закалядавалі агулам пяцьсот злотых. Звычайна давалі ім па дзесяць злотых.

— А што найбольш запамяталася?

— Адзін дзядзька не хацеў выпусціць з хаты. Ён патрабаваў, каб спявалі яму чатыры разы „Нова радасць стала". Мы спявалі, а ён... плакаў уголас...

У гэтым месцы трэба сказаць і такое — не ўсе спевакі паводзяць сябе прыстойна.

— Do tej chałupy nie zachodzimy, za mała! — вырашылі адны маладзёны і пайшлі да наступнай мураванкі.

* * *

Вясковыя людзі крытычна ацэньваюць калядоўшчыкаў.

— Спявалі, як кіем па плоце! — кажуць пра такіх, якія не адчуваюць рытму і мелодыі. Папракаюць, калі калядоўшчыкі не ведаюць слоў, або ходзяць з неабноўленай гвяздай.

У гэтым годзе ў Катлоўку завіталі толькі чатыры групы. Усе акуратна калядавалі і паводзілі сябе тактоўна. На першым месцы трэба назваць сястрычкі з хутара пад Ласінкай. Дзяўчынкі прыехалі на свята да бацькоў, штодзень яны пражываюць у Дзіцячым доме ў Белавежы. Заспявалі як тыя анёлы з яснага неба. Ад пачатку да канца праспявалі беларускую калядку „Учора з вячора."

— А хто вас так прыгожа навучыў спяваць? — пытаю дзяўчынак. — Наша пані Оля з Белавежы!

* * *

Нашы калядоўшчыкі, калі ўваходзяць у хату, кажуць прывітальны верш. У маёй вёсцы захавалася прывітанне на старабеларускай мове. Паслухайце як файна яно гучыць.

— Пане, гаспадару, пані господыні...
Дзісь Хрыстос родзіўся —
свет возвеселіўся!
Мы прышлі Ісуса Хрыста славіті,
Ваш двор веселіті,
Вам і нам весёлым быті...

— Колядоваті — чы не?

— Калядуйце! Калядуйце! — звычайна адказваюць гаспадары...

Дарослыя ведаюць, што ад іх залежыць радасць дзяцей. Запрашаюць на наступны год. Часам частуюць цукеркамі, а наймалодшых пакідаюць пагрэцца ля печкі. Як сёлета, бо Каляды былі як трэба — з моцным марозам і чыстым снегам.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У Беластоку калядавалі дзеці з ПШ н-р 4

Вершы Віктара Шведа

Экалагічная настаўніца

Бацька задае пытанне
Сыночку лагічнае:
— Якая ў школе ваша пані?
— Яна экалагічная.

— А што абазначае гэта?
Нешта несамавітае.
— Няма ніякага сакрэту,
Яна ж не ядавітая.

Многажонства і аднажонства

— Як многажонства назваць можам,
Згодна са школьнай праграмаю?
Бацька адказвае: — Сярожа,
Па-мойму гэта палігамія.

— А аднажонства, мілы татка,
Скажы мне без іроніі?
— Я аднажонства, без аглядкі,
Назваў бы манатоніяй.

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Такая праўда?

Цікавіць мяне свет,
Цікавыя людзі ў ім жывуць.
І кожны з іх дзівуецца,
Што мае той, а чаго мне не хапае.

Ніколі не глядзім сабе ў вочы,
Ці праўду ў іх скрываем?
Ужо ніколі не дазнаемся,
Дзе праўда, а дзе мана.

Кожны замкнуты сам у сабе.
Калі ён схоча гаварыць,
Тады ніхто, сапраўды ніхто,
Не схоча яго слухаць.

Эмілія БАНДАРУК,
Старое Ляўкова, ПШ у Нараўцы

Віктар Швед у Дубінах

Ужо з самага ранку ў школе адчувалася вялікае ажыўленне. Усе чакалі прыезду вельмі любімага і папулярнага сярод дзяцей і моладзі паэта — Віктара Шведа. Яго творы вучні часта дэкламуюць на конкурсах, а таксама чытаюць іх на ўроках беларускай мовы. У сустрэчы ўдзельнічалі ўсе навучэнцы роднай мовы.

А калі ўжо Віктар Швед паявіўся перад моладдзю і настаўнікамі, усе прыціхлі, а затым пачуліся громкія воплескі на знак цёплага і сардэчнага прыёму паэта. Пасля гэтага В. Швед таксама прывітаўся з прысутнымі ветлівымі словамі.

Аказалася, паэт належыць да вельмі плённых творцаў. Піша на беларускай і польскай мовах, а таксама займаецца перакладамі твораў. Аб яго працавітасці сведчыць вялікая колькасць зборнікаў на беларускай і польскай мовах.

Пазней Віктар Швед чытаў свае вершы. Са слоў паэта вынікае, што інспірацыяй многіх яго твораў праўдзівыя жыццёвыя здарэнні і факты, якія ён убірае ў прыгожыя словы і пералівае іх на паперу.

У час сустрэчы вучні маглі таксама ставіць госцю пытанні, на якія ён дакладна адказваў.

На заканчэнне сустрэчы гімназістка Міра Прычыніч падзякавала паэту за прыезд, за цікавы ўрок беларускай мовы і пажадала яму доўгіх гадоў жыцця ў добрым здароўі, поспехаў у творчай працы ды асабістым жыцці.

Пасля выступлення В. Швед падпісваў зборнікі сваіх вершаў. Кожны хацеў мець кніжку з аўтографам аўтара.

Сустрэчай былі задаволены і вучні, і сам паэт. Сцвердзіў ён, што ў апошні час у яго ўсё менш нагод для такіх паездак і сустрэч з моладдзю.

Сустрэчу арганізавалі настаўніцы беларускай мовы **Ніна Куптэль** і **Валянціна Касцевіч**, а фінансавую дапамогу атрымалі яны ад **Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь**. Вялікай прыхільніцай арганізацыі ў школе цікавых заняткаў з'яўляецца таксама дырэктар **Тамара Крайнік**.

Вучні і настаўнікі школы ў Дубінах

PS. З нагоды Каляд і Новага года ўсім працаўнікам Рэдакцыі жадаем многа здароўя, поспехаў у Вашай цяжкай працы і ў асабістым жыцці.

Званок і кветка-пяць пялёсткаў

(Міхаліне і Паўліне прысвячаю)

(казка)

Даўным-даўно на зялёным лузе раслі сабе дзве кветкі: сіні званочак і кветка з пяццю чырвонымі пялёсткамі. Сонейка іх абагравала, дожджык паліваў, весела спявалі птушачкі і гудзелі пчолы. Аднойчы на лузе паявіўся каляровы матылёк. Ён быў такі прыгожы, яго чароўнаму шэлесту крылаў не маглі надзівіцца кветкі. Захапляліся ім бясконца. Аднак матылёк не прабываў доўга ў гэтым кутку зялёнага лугу, ён паляцеў далей, але абяцаў кветкам яшчэ іх наведаць.

Званочак і кветка з пяццю чырвонымі пялёсткамі засталіся адны. Нешта дзіўнае здарылася, калі адляцеў матылёк. Сіні званочак пачаў задумоўвацца над сваёй прыгажосцю. Дайшоў ён да вываду, што толькі ў яго далікатныя пялёсткі складаюцца ў вышуканую форму, ды яшчэ сіні колер. Сіні як неба... Званочак пачаў ганарыцца сваёй прыгажосцю, параўноўваў сябе да вялікага Тварца свету, хаця б колерам. Што ж магла сказаць кветка з пяццю пялёсткамі? Яна заставалася сумнай, ціха разводзіла свае чырвоныя пялёсткі, з недаверлівасцю слухала гаворкі Іванка. Сіні званочак пачаў здзекавацца над кветкаю за яе чырвоны колер, за пяць пялёсткаў, за непрыгожы выгляд, за тое, што чырвонай кветкі няма да чаго параўнаць. Кветка з пяццю пялёсткамі адчувала сябе пакрыўджанай, ёй стала так прыкра, што начамі, калі званочак спаў, маленькія кроплі слёз падалі долу, а раніцай абярнуліся ў бліскучую расу. Сіні званочак не спыняў ганарыцца сабой, а на кветку — увогуле не звяртаў увагі.

Матылёк стрымаў дадзенае слова і зноў завіраваў вакол кветак. Ён адчуваў сваім матыльковым сэрцам, што чырвоная кветка з пяццю пялёсткамі стаіць маўклівай, без жыццядайнай радасці і бачыў, што званочак хваліцца ўсімі сваімі здольнасцямі і прыгажосцю. На жаль, матылёк быў шмат разоў чароўнейшым, чым званочку самому хацелася быць. Матылёк прабаваў размаўляць з чырвонай кветкай, далікатна кранаў яе пялёсткі... Яна ажыла сваім сэрцам кветкі. Пяць пялёсткаў карыстала з кожнай супольнай хвіліны з матыльком. Але сіні званочак не мог сцярпець гэтага! Як ні стараўся паказваць сябе з самага лепшага боку — матылёк выбіраў „брыдкую" кветку.

Ад чорнай зайздрасці сіні званочак перастаў быць сінім. Колер кветкі дзесьці знік, а яна сама стала чорнай. Матылёк і кветка пяць-пялёсткаў не сказалі званочку дрэннага слова, але ён сам зразумеў, што прыгажосць не з'яўляецца самым важным у свеце.

Аня Садоўская

Я — спартсмен...

... таму і задумаў апісаць гімнастычную залу ў Гайнаўскай белгімназіі. Мы праводзім у ёй заняткі па фізкультуры, а я асабіста — праводжу тут тры трэніроўкі ў тыдзень.

Зала падзелена на баскетбольную, валейбольную і тэнісную пляцоўкі. Тут знаходзяцца кашы да гульні ў баскетбол і сеткі для валейбола. Каля гімнастычнай залы знаходзіцца раздзявальня. Ёсць тут таксама душы — пасля трэніроўкі мы можам памыцца. Матрацы, мячы, плоцікі ды іншыя спартыўныя прылады знаходзяцца ў асобным памяшканні.

У падвале пад гімнастычнай залай — зала для атлетычнай гімнастыкі, г.зв. сілоўня. Там мы, значыць, хлопцы, развіваем нашы мышцы, каб падабацца дзяўчатам. Ёсць тут усе неабходныя прылады стаць „суперменам". У нашай гімнастычнай зале праводзяцца баскетбольныя і валейбольныя матчы, напрыклад, гайнаўскай каманды „Мадэратар".

Раз у год у гэтай зале вучні чацвёртых класаў праводзяць сваю стаднёўку.

Марыюш Панькоўскі,
беглімназія ў Гайнаўцы

Польска-беларуская крыжаванка № 3

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 51: Акацыя, праца, аванс, баба, жонка, сад, абавязак. Ас, збожжа, арабінка, кава, цаца, Кася, цана, газ, язда, вяз, крок.

Узнагароды — аўдыё-касеты з беларускімі казкамі і песнямі — выйгралі: **Анна Раманюк** са Старога Беразова, **Эмілія Антасюк** з Дубін, **Ева Казлоўская** і **Агнешка Андраюк** з Бельска-Падляшскага, **Пётр Герасімюк** з Арэшкава. **Віншуем!**

Палескі клін

Пасля падпісання ў 1921 г. паміж палякамі і саветамі Рыжскага дагавору і падзелу Беларусі і Украіны, сярод польскіх палітычных элітаў вялася інтэнсіўная дыскусія наконт палітыкі ў справе г.зв. крэсаў усходніх. Дыскусія ішла не ў справе асіміляваць ці не асіміляваць беларускае і ўкраінскае насельніцтва, а толькі якімі метадамі прывесці мясцовае грамадства да польскай нацыянальнай супольнасці. На фоне шматлікіх планаў і прапаноў наконт інтэграцыі ўсходніх ваяводстваў арыгінальнасцю вылучаўся праект палескага ваяводы Станіслава Даўнаровіча. Яго змест быў праявай вельмі характэрнага для палітычных элітаў II Рэчы Паспалітай мышлення.

Даўнаровіч прадбачваў, што на ўсходзе будуць развівацца два антыпольскія нацыяналізмы — беларускі і ўкраінскі, і што Расія будзе імкнуцца вырваць гэтыя рускія землі з-пад польскага кантролю. Ключом для вырашэння польскай палітыкі на ўсходзе — паводле ваяводы — было Палессе, зямля, якую лічыў ён нічыёй па культурным характары. Крэсы, — пісаў, — будуць належаць Польшчы тады, калі першая прынясе сваю культуру на Палессе. Ад поўначы і поўдня набліжаліся на Палессе два нацыяналізмы. Кожны з іх меў магчымасць авалодаць душы мясцовага — „тутэйшага" — насельніцтва. Найгоршым варыянтам для польскіх дзяржаўных і нацыянальных інтарэсаў было б, калі б „гэтыя нацыяналізмы падалі сябе руку над Прыпяццю", — пісаў ваявода.

Беларускі нацыяналізм хаця, паводле Даўнаровіча, больш лагодны і горш арганізаваны, аднак надта трывалы і не трэба яго ігнараваць, — напамінаў польскім палітыкам. Украінскі, лепш арганізаваны, больш магутны і драпежны мог бы паўплываць на беларускі і ўчыніць яго больш дынамічным. Рэалізацыя асіміляцыйнай палітыкі магла б ажыццяўляцца толькі пры ўмовах дамінацыі польскай культуры на крэсах. Палессе з'яўлялася адзінай правінцыяй, дзе не было перашкодаў дзеля збудавання польскай культурнай прасторы, раздзяляючай беларускую і ўкраінскую. Таму асноўнай мэтай дзяржаўнай палітыкі павінна быць імкненне завалодаць нічыёй зонай, каб не дапусціць да спалучэння суседніх, блізкіх сабе, нацыяналізмаў. Трэба аднак быць свядомым, — пісаў, — што замацаванню беларускага і ўкраінскага руху на Палессі будзе спрыяць расійскі нацыяналізм, вельмі слабы на гэтай тэрыторыі, аднак сваю імперыяльную палітыку можа ён ажыццяўляць, прыкідваючыся змаганнем за беларускія і ўкраінскія інтарэсы.

„Насельніцтва Палесся, — падкрэсліваў, — гэта, на шчасце для нас, малаасвядомыя і малаактыўныя сялянскія масы. Гэту акалічнасць можна і трэба выкарыстаць". Трэба аднак было ўсё пачынаць з нуля, таму што з даўняй польскай і апалячанай шляхты асталіся толькі астаткі, а Каталіцкі касцёл амаль перастаў тут існаваць. На Палессі, — пісаў ваявода, — патрэбны дзяржаўныя інвестыцыі, асаднікі, паланізацыя адміністрацыі, судовай сістэмы і гарадоў. Патрэбны таксама быў новы адміністрацыйны падзел крэсаў.

Даўнаровіч прапанаваў беларускі арэал, дзе існуюць беларускія арганізацыі, палітычныя эліты, нацыянальна свядомае грамадства, адміністрацыйна спалучыць з моцна спаланізаванай Вільняй. Дзеля гэтага павінна было быць ліквідаванае Навагрудскае ваяводства, а Баранавіцкі, Нясвіжскі, Стаўбцоўскі і Слонімскі паветы — далучаны да Палескага ваяводства. З Валынскага ваяводства прапанаваў далучыць да Палесся рэдка заселеныя раёны, да якіх не дайша яшчэ хваля ўкраінскага нацыяналізму. На балотах, раздзяляючых Палессе і Валынь, прапанаваў не будаваць ніякіх дарог, ніякай інфраструктуры спрыяючай кантактам людзей гэтых правінцый. Украінскі рух, — лічыў, — трэба затрымаць на мяжы палескіх балотаў. Пашыранае на поўнач і поўдзень Палессе мела стаць зонай асіміляцыйных эксперыментаў.

Ваявода разлічваў, што працэс паланізацыі Палесся, пры адпаведнай каардынацыі дзяржаўнай палітыкі, можа прайсці вельмі хутка. Польскае па культурным характары Палессе магло б уклініцца паміж беларускі і ўкраінскі рух ды стаць базай для экспансіі польскіх уплываў на поўнач і поўдзень. Упершыню аднак трэба было ўпарадкаваць сітуацыю над Прыпяццю. Даўнаровіч прапанаваў узяць пад кантроль інфармацыйную сістэму і не дапускаць да любой крытыкі польскай улады ў прысутнасці „цёмнай, чужапляменнай масы". Прапанаваў будаваць касцёлы і ўчыніць іх інструментам дзяржаўнай палітыкі. Дзеля гэтага, — лічыў, — урад павінен мець вырашальны ўплыў на кадравую палітыку Каталіцкай царквы. Дарогай змены кадраў таксама прапанаваў расійскую па культурным характары Праваслаўную царкву пераўтварыць у польскую. Разлічваў, што па прычыне ўнутранай канструкцыі Праваслаўнай царквы можа стаць яна нават лепшым інструментам дзяржаўнай паланізацыйнай палітыкі, чым Каталіцкі касцёл.

Дзяржава, — паводле Даўнаровіча, — павінна засяродзіцца перш за ўсё на паланізацыі палескіх гарадоў. Брэст, Пінск, Кобрын, Пружаны, Лунінец, Сарны, Косава як яўрэйскія мястэчкі не маглі выканаць тую цывілізацыйную місію на ўсходзе, якую раней выканалі, напрыклад, Вільня ці Львоў. Прапанаваў кіраваць асаднікаў не ў вёскі, а толькі ў гарады, адкуль разыходзіліся ўплывы на гмінную правінцыю. Трапна заўважаў ваявода, што ніколі вёска не накідае свае культуры гарадам, а заўсёды бывала наадварот. Ішло аднак каб прыцягнуць да палескіх гарадоў не чыноўнікаў, якія прыязджалі і ад'язджалі, а толькі рамеснікаў, прадпрымальнікаў, купцоў, якія мелі б там моцнае фінансавае замацаванне, складалі б эліту, ад якой залежнае было б мясцовае грамадства. Патрэбныя былі аднак не дзесяткі, але сотні тысяч асаднікаў.

Гарадское асадніцтва выклікаць можа толькі супярэчнасць інтарэсаў з мясцовымі яўрэямі, але такі канфлікт не стварае ніякай небяспекі для дзяржаўных інтарэсаў. Вяскове асадніцтва, наадварот, выклікае антыдзяржаўныя і антыпольскія настроі сярод мясцовага сялянства, якое мела быць прадметам асіміляцыі. Таму зямлю, — лічыў ваявода, — трэба даваць палешукам так, каб былі перакананы, што атрымалі яе ад польскай улады.

Прапановы ваяводы Даўнаровіча сталі фундаментам мышлення палітычных элітаў пра Палессе. „Палескі клін" — гэта тэрмін, які часта выступаў ва ўрадавых дакументах. Толькі ў справе асадніцтва кіруючыя краінай групы не падзялялі яго прапаноў. Большасць паланізацыйных планаў прадбачвала не гарадское, а вясковае асадніцтва. У адным з праектаў паланізацыі крэсаў ад 1935 г., распрацаваным Міністэрствам унутраных спраў, фрагменты прысвечаныя Палессю паўтараюць асноўныя тэзісы ваяводы Даўнаровіча. Ідучы следам яго мышлення архітэктары ўнутранай палітыкі прыйшлі да вываду, што для інтарэсаў краіны неабходна таксама раздзяліць валынскіх і галіцкіх украінцаў. Дзеля гэтага планавалі будаваць чарговы клін, які меў займаць тэрыторыю Тарнопальскага ваяводства, Сокальскі павет Львоўскага і Уладзімірскі павет Валынскага ваяводстваў. У абодвух выпадках кліны мелі засяліць асаднікі-сяляне з цэнтральнай Польшчы.

З прычыны паслаблення беларускага руху ў 1930-х гадах, ліквідацыі большасці арганізацый, паводле ўрадавых аналізаў, знікла на Палессі небяспека замацавання беларускіх уплываў. Украінскі ўдалося таксама затрымаць на Валыні. Палессе ў планах дзяржаўнай адміністрацыі патрацілa сваё стратэгічнае значэнне. Чыноўнікі і журналісты пісалі пра палешукоў: „польскі люд крэсовы". Разам з саветамі восенню 1939 г. прыйшло вялікае расчараванне. Палескі люд аказаўся найбольшым на „ўсходніх крэсах" прыхільнікам „рэвалюцыйнага парадку". Там дзе былі сляды беларускага нацыяналізму ніхто не атакаваў ні польскіх памешчыкаў, ні чыноўнікаў, ні настаўнікаў.

Яўген Мірановіч

Юбілейная сустрэча з паэтам

З нагоды 30-годдзя творчай працы Юрыя Баены і выхаду яго навейшага зборніка „Крык дзікай ружы" 11 снежня 2003 года ў Бельскім доме культуры адбылася сустрэча паэта з чытачамі. Арганізавала яе і вяла Альжбета Фіёнік. Паэзію Юрыя Баены дэкламавалі дзяўчаты з тэатральнага гуртка „Антракт". Юбіляр распачаў сваё выступленне з успамінаў.

— Мой дэбют адбыўся пасля смерці маці ў 1973 годзе і было гэта абарончае захаванне. Узяў я пяро, каб уцячы ад рэчаіснасці. Першы мой верш надрукаваны быў у „Зорцы". Тады жыў я ў Мокрым і быў вучнем шостага класа Падставовай школы ў Дубяжыне. Многа дапамог мне тадышні галоўны рэдактар „Нівы" Георгій Валкавыцкі, які даваў парады і мае вершы друкаваў у тыднёвіку, — сказаў паэт. — Зараз пішу, калі мне цяжка і калі хачу адарвацца ад рэчаіснасці. Вершы дапамагаюць забыць аб непрыемных справах.

Другім зацікаўленнем будучага паэта было мастацтва. Выконваў ён у школе класныя насценгазеткі. Хацеў паступіць у мастацкі ліцэй у Супраслі, але такой прапановы не адобрылі сямейнікі. Закончыў Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, а пасля геаграфічны факультэт на Універсітэце імя М. К. Складоўскай у Любліне. Многа падарожнічаў па Польшчы, аднак яго вершы з гэтага перыяду, у галоўным, прысвечаны Беласточчыне. Зараз Юрый Баена працуе старшынёй Бельскага аддзялення Саюза польскіх настаўнікаў і піша вершы для чарговага зборніка.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Юрый Баена

Альжбета Фіёнік расказала пра творчасць Юрыя Баены. У зборніку „Лісты блакітных успамінаў" (1991) змешчаны вершы школьнага і студэнцкага перыяду. У зборніку „Вечар над светам" (1998) паэт клапоціцца аб прыродзе і вяртаецца ўспамінамі ў родную вёску. Апошні зборнік „Крык дзікай ружы" з'яўляецца падвядзеннем вынікаў 30-гадовай творчай працы. Аўтар больш увагі адводзіць у ім людзям. Паказвае міграцыю ў гарады і пагрозу для нацыянальнай спадчыны. Кніжка канчаецца аптымістычнымі словамі паэта, якія сталі лозунгам спаткання — „Неба няхай раскалыша звон надзеі".

Вучні спыталі літаратара пра яго моўны варштат.

— У дзяцінстве размаўляў я на беларускай гаворцы. Спачатку, у падставовай школе, усім прадметам вучыўся на беларускай мове, а пасля на польскай. Хаця ведаю польскую мову, вершы пішу па-беларуску, — заявіў Юрый Баена, заклікаючы, што вучням нельга забываць кірыліцу.

Моладзь звярнулася да паэта за парадамі для пачаткоўцаў. Юрый Баена раіў не хаваць першых вершаў у шуфляду, але паказваць іх настаўнікам або іншым кампетэнтным асобам для ацэнкі.

— Варта пісаць, бо гэта найвышэйшая форма актыўнасці, якая адкрывае душу чалавека. Тое, што чалавек напіша больш вартаснае, чым тое што скажа. Важна, каб пісаць самастойна, бо цэніцца творчая асабовасць, — раіў паэт.

Аляксей Мароз

Беларускія моманты ў „Картках”

Фота А. МАКСІМЮКА

Размова з беларускім перакладчыкам, адным з рэдактараў часопіса „Правінцыя”, родам з Беласточчыны, а пражываючым у Празе — Янам Максімюком адкрывае найнавейшы (31) нумар часопіса „Kartki”. Не першы раз у гэтым нерэгулярна паказваючымся ў Беластоку, з агульнапольскім абсягам, літаратурна-мастацкім часопісе, належнае месца прысвечана творчасці, публіцыстыцы і асобам звязаным з беларускім асяроддзем. У размове „Wszystko przez «Ulissesa»” Пятра Брысача і галоўнага рэдактара часопіса Багдана Дудко Ян Максімюк прызнаецца:

— Я жыву ўжо некалькі добрых гадоў у Чэхіі, але заўжды, калі прыязджаю на Беласточчыну, адчуваю, што вяртаюся на радзіму, што гэта штосьці значна большае, чым дом. Тут ёсць тое, у чым пагружана мая душа.

І пасля перакладчык на беларускую мову „Уліса” і на польскую кніжак Адама Глёбуса, Уладзімера Арлова і Васіля Быкава зазначае:

— Не патраплю нічога зрабіць для Беларусі ў тым сэнсе, што не патраплю пераканаць нікога, што варта быць беларусам (...). Калі патрактаваць маю Беларусь як тое, што вынес я з дому — выхаванне, культуру, мову, уражлівасць на свет — то можна сказаць, што яна пастаянна „робіць штосьці для мяне” і я яе безупынны даўжнік.

У „Картках” апублікавана апавяданне „Самагубца” Ігара Сідарука, паэта, празаіка і драматурга з Кобрына, якраз у перакладзе Максімюка. Гэты пераклад якраз доказ на ўражлівасць і г.зв. моўны слых перакладчыка.

„Аб польскай штодзённасці вельмі цяжка сказаць штосьці разумнае і з сэнсам. Я парадаксальна сказаў бы, што няма сёння польскай штодзённасці”, — так у сваю чаргу пачынае свой тэкст „Życie jest baśnią” прафесар Уладзімір Паўлючук, сацыёлаг, антраполаг і мовазнаўца, ураджэнец Рыбал. У той „казцы” пераплятаюцца роздумы прафесара аб рэальнасці звычайных-незвычайных людзей, перакладзеных у гэты раз на мову тэлебачання ды такой „казцы”, як вайна ў Іраку. На канец прафесар Паўлючук, выкладчык Ягелонскага ў Кракаве і Беластоцкага універсітэтаў робіць агаворку, што не ведае, ці казка-лякарства на ўсякі маштаб рэальнасці выпадкова не зваліцца пад напорам якраз яе.

Да апошняга нумара „Картак” далучаны зборнік вершаў народжанай у Гайнаўцы маладой паэтэсы Ірэны Стэльмах, аздоблены карцінамі беларускага мастака, які цяпер жыве ў Беластоку, народжанага ў Рыбалах — Юркі Федарука. Каляровая фатаграфія ягонай працы, амаль сцэнаграфічнага праекта, адкрывае таксама апавяданне празаіка з Рыбакоў Нарваўскай гміны Міраслава Грыкі „Смерць доўгага сну”. Паяўляюцца ў ім тэатральныя матывы, быццам бы на апраўданне таго, што ўсё — тэатр з уздымамі ды Танатасам у ролі суфлёра. „Смерць прыходзіла толькі тады, калі мог ужо распазнаць праз вітражнае акно мёртвы сад. І тая хвіліна была заўжды збаўленнем. І была прадказаннем чарговай агоніі”, — расказвае аб адным са сваіх герояў Міраслаў Грыка. (холм)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Зімой Віктар Кабац працуе толькі па некалькі гадзін

Мастацтва і грамадская праца

Калі я зайшоў у майстэрню гайнаўскага мастака Віктара Кабаца, якая знаходзіцца ў старым гаспадарчым будынку Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, быў ён заняты працай. У драўляным памяшканні было холадна, але агонь з печы крыху абагураваў памяшканне. У вялікім пакоі разложаны былі недакончаныя работы, а на вялікім стале ляжалі фарбы і пэндзлі.

— Зіма ў маёй працы з'яўляецца вельмі цяжкім перыядам. Надвор'е не дазваляе на даўжэйшую работу ў пленэры. Зімой замірае прырода і складана перадаць яе клімат у маіх работах. У пушчы раблю толькі эскізы. Пасля іх дапрацоўваю ў майстэрні або на падставе іх ствараю новыя. Найлепшыя работы ўзнікаюць на падставе накідаў, зробленых вясной або восенню, калі можна заўважыць шмат колераў, — расказвае Віктар Кабац. — Зімой працую ў майстэрні толькі па некалькі гадзін. Калі ў пакоі холадна, найлепш працаваць з алейнымі фарбамі, бо імі можна карыстацца нават у нізкіх тэмпературах.

Зараз Віктар Кабац рыхтуецца да вялікай (на 50-60 работ) выстаўкі ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы.

— Будуць гэта, перад усім, алейныя работы аб Белавежскай пушчы і яе наваколлі. Ёсць у мяне работы з Нараўчанскай і Дубіцкай гмін і беларускай часткі Белавежскай пушчы, — кажа гайнаўскі мастак. У будучыні намерваецца паказаць 33 работы на тэму трагедыі ў Курапатах. Некаторыя з гэтых работ паказваліся ўжо ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы.

— Зараз вядуцца размовы ў справе супрацоўніцтва мастакоў з Польшчы і Беларусі ў рамках Еўрарэгіёна „Белавежская пушча”. Зімой наладзім у Гайнаўцы сустрэчу з беларускімі калегамі і вырашым арганізацыйныя пытанні, — інфармуе Віктар Кабац.

Віктара Кабаца зімой можна спаткаць у гайнаўскіх бібліятэках і культурных установах, дзе бясплатна выконвае або памагае рыхтаваць экспазіцыі. Паколькі ён вельмі любіць Белавежскую пушчу, адпраўляецца ў яе на пешаходныя і веласіпедныя экскурсіі.

— Вельмі перажываю, калі бачу высечку старых сосен, якія вырэзваюцца як хворыя дрэвы, — гаворыць мастак. Свае перажыванні адлюстроўвае ў мастацкіх працах, дзе часта паяўляецца матыў старых сосен. Па яго ініцыятыве ладзіліся некаторыя выстаўкі гайнаўскай мастацкай групы „Гайна”, да якой сам належыць.

Аляксей Мароз

Цяжкая доля

У „Ніве” № 50 (2483) за 2003 г. пісаў я пра ўрачыстае адкрыццё беларускага консульства ў Белай-Падляшскай, але напісаў толькі важнейшае. А варта прыглянуцца і менш важнаму аспекту тае падзеі. У ліку афіцыйных гасцей убачыў я аднаго адзінага святара. Пазней высветлілася, што гэта тамашні праваслаўны настаяцель. Я крыху раней, маючы шматок часу, прайшоўся па наваколлі консульства, у тым ліку і вакол неадлеглай царквы і прылягаючых да яе могілак. Было відаць, што прыходзік там невялічкі...

Магло б узнікнуць здзіўленне, чаму на ўрачыстасці, у ліку ўсёй тамашняй знаці, не было большаснага каталіцкага духавенства. Мяркую, што не запрасілі. І нечаму тут дзівавацца: апошняе духавенства мае свой адзіны цэнтр па-за межамі большасці краін, у Рыме, і яго немагчыма да канца ўзяць пад абцас. Таму адносіны да яго з боку афіцыйнага Лукашэнкавага Мінска не надта іншыя, чым і самадзяржаўнай Масквы, якая шмат настойлівей намагаецца выкурыць яго са сваёй тэрыторыі. Нейкі час таму Варшава голасна абуралася на забарону ўезду ў Расію біскупа Мазура. Хаця Крэмль у сваіх адносінах да каталікоў спасылаецца на сваіх іерархаў, а Пуцін наведвае папу, усё ж такі пагранічнікі іерархам не падпарадкаваныя і не ад іх прыйшла згаданая забарона. Мінск не гуляе ў жмуркі: у час папскага візіту ў Украіну „атэіст” Лукашэнка разам з маскоўскім патрыярхам вельмі дэманстратыўна апратэстоўвалі той візіт рымскага іерарха, скачучы вакол беларуска-ўкраінскай граніцы.

У той час, калі ў Белай-Падляшскай адкрывалі консульства, „падляшскі” Беласток зрабіў спробу прабіцца ў польскія перадавікі. І тут у фоне галоўных падзей апынулася большаснае духавенства: на гэты раз адна беластоцкая надта рэлігійная дама, гарадская радная, адчула абразу сваіх рэлігійных пачуццяў яго прысутнасцю на карціне ў галерэі. Прэзідэнт горада спалохаўся не на жарты: за такую правіну немінуемы бабух у смаляны кіпяток — *па амен*, бо ж душа вечная... І выстава праваліласа.

Мо я памыляюся наконт адсутнасці ксяндзоў у час адкрыцця беларускага консульства. Мо Мінск не даваў забароны, толькі была свядомасць небяспекі, што іх прысутнасць можа абразіць каго „падляшскія” рэлігійныя пачуцці, а тады скандал — у міжнародным маштабе — немінуемы. Цяжкая доля нашага беларуса, але нялёгка і суседнім ксяндзам.

Аляксандр Вярбіцкі

Ліст у рэдакцыю

Найперш — шчырае, шчырае Вашай газеце дзякуй, што надрукавалі выдатны артыкул Я. Максімюка пра Зору Кіпель. Артыкул незвычайны. Вялікая падзяка — Зора сапраўды жыла Беларуссю і працай для яе. Далей, быў бы Вам вельмі ўдзячны, калі б маглі Вы мне прыслаць кніжку Вашага выдавецтва пра бежанства. Справа ў тым, што мяне гэтая тэма цікавіць усё жыццё, як усё жыццё давялося і рухацца. Напэўна, гэткае пачуццё, напамінак далёкага дзяцінства, калі ў лексіконе „вакзал”, „вагон”, „кіпяток”, „дом калхозніка” і падобнае былі важнымі жыццёвымі паняццямі. Калі яшчэ тыя кнігі ў Вас ёсць, буду ўдзячны атрымаць.

І яшчэ адна справа. Як даводзіць статыстыка — каля 50 000 беларусаў на Беласточчыне — не так ужо і дрэнна. Беручы пад увагу, колькі беларуская нацыя страціла дэмаграфічна — адыход „праваслаўных палякаў”, амаль поўнасцю страчанае беларускае каталіцкае жыхарства, дык 50 000 — гэта здаровы паказчык. Дай Бог, каб лік павялічваўся! Можа школкі, гурткі, дзіцячыя садкі дапамогуць. Але адно, на мой погляд, бясспрэчна — друк дапамагае трымаць беларускасць: Ваша газета, падручнікі, кнігі. І вось у мяне не выходзіць думка: можа, выдатны бібліяграф айцец Сасна, а мо хто іншы ўкладзе „Беларускую і беларусаведную бібліяграфію Беласточчыны”? Можа гэта і нерэальна, але я Вам гэта хацеў выказаць. Вось такімі думкамі я хацеў падзяліцца з Вамі.

Усяго найлепшага ў Калядным сезоне.
З вялікай пашанай

Вітаўт Кіпель

Дзяцінства заварожана хвалямі

Новыя людзі

Я ўсё больш праводзіў час на волі. Калі ўсё часцей ехалі людзі ў кузню, двор дзядзькоў станавіўся цікавейшым. Нехта меў патрэбу каня падкаваць, некаму калёсы або сані паламаліся, кожны мог разлічваць на дапамогу каваля. А ў кузні колькі прыладаў: і малаткі, і кавадла, і горан, і мех-паддувала. Людзі ўсё часцей ездзілі па нашай дарозе. Дзядзька Болісь — каваль купіў нават сабе ровар. Напачатку гэты „Niemen" быў вельмі небяспечнай машынай. Баяліся яго і коні, і сабакі, і трэба было шмат часу, пакуль не прывыклі. Па дарозе хадзілі і маляры, якія малявалі „каўры" на ільняным палатне — „алені, жар-птушкі". Бывалі і жабракі з гармонікам. Часам ездзіў жыд, здаецца, Евіль яго звалі. Жыў ён, бадай, у Плісе і збіраў старую вопратку, анучы. Едучы каля хат, крычаў: „Бабы, бабы, рыззё!" Даваў за гэта талеркі ці іншую дробязь. Раз начаваў у майго бацькі. Прывязаў кабылу да калёс перад хатай. Павесіў ёй на морду мяшок з сечкай (а можа з аўсом), сам лёг у хаце за сталом на лаве. Размаўлялі з бацькам амаль да поўначы. Евіль багата аб чым расказваў. Гаварыў, што ў Амерыцы прыдумалі такі тэлефон, у якім можна бачыць свайго суразмоўцу, як у люстэрку. Ці да вайны былі такія тэлефоны? Хто яго ведае. Але цікава было слухаць. Майго бацьку, асабліва ў святочныя дні і ў зімку наведвалі старэйшыя вяскоўцы. Прыходзілі яны стрыгчыся і брыцца. Яны таксама пра многае гаварылі. Успаміналі падзеі з першай сусветнай вайны. Я, седзячы на печы, або, калі раніцай, лежачы ў ложку за шафай, слухаў тыя страхоўці, не ўяўляючы, што было ўсё гэта ледзь не перад маім нараджэннем. Некаторыя гаварылі з упэўненасцю, што яшчэ крыху і вайна зноў новая будзе. А дзядзька Антон з Псуя — жартаўнік — казаў, што немцы з палякамі біцца будуць і наканец мяжа будзе бегчы праз папову лазню. Лазня бацюшкі стаяла блізка возера, амаль на мяжы зямель Псуя і Абруба. Чаму Нямеччына на псуйскім баку мела пачынацца? Можа таму, што суседка Антона, настаўніца Іда, была немкай з паходжання. Яе муж „ліцьвяк" Едзевіч, рысаваў партрэты, рабіў прыгожыя цацкі. Мой бацька мне ад яго раз прынёс лыжку, вілку і нож. Маляваныя, з дзерава, былі з выгляду як праўдзівыя. Якая ж была радасць! Бо якія дзеці ў вёсцы цацкі мелі? Свісток з прутка зроблены, шарык са свінскага пузыра — пазней мячыкі прадавалі, але ці кожны купіў? Але ж дзеці гулялі. І калі не галадалі, дык і вясёлымі быць умелі. Мне галадаць не прыйшлося. Бацька меў карову, харчаваліся мы малочнымі прадуктамі — малаком, сырам, маслам. Бацька наліснікі з тварагом пёк, варыў суп, бульбу і было цудоўна. А мяса? Часам таксама бывала, толькі сала я нават і ў рот не вазьму. Раз дзядзька Бронька, калі я на вячэру папрасіў хлеба да супу, даў мне спрытна ўложаны ў хлеб скрылёк сала. Я ледзь укусіў гэта і адразу ж з кулакамі на яго кінуўся. У бойцы перамог дзядзька — спытаў толькі, ці хачу паехаць у лодцы на возера. Згода была дадзена. Праўда, лодкі ў дзядзькі не было, але ж на ляшчоўцы Юстынава стаяла. А ўсё ж мы паехалі не лодкай, а на калёсах. Не на возера, а ў Чарневічы, бо там быў фэст на Яна. Гэта была першая мая такая далёкая паездка. Ехалі мы праз чужыя вёскі і затрымаліся ў сваяка Багдановіча. Не дадзена нам, аднак, было пайсці на фэст, нават і ў царкве мы не былі. Наш сваяк, член пажарнай каманды, калі пачуў гудок сірэны, хуценька апрануўся ў форму пажарніка, у касцы і з тапарком пры дзязе пабег пажар тушыць.

Паездка ў Чарневічы ўрэзалася ў маёй памяці не толькі таму, што ўпершыню пабачыў пажарніка, але і таму, што дагэтуль прывыкшы адрозніваць дзень святочны ад шэрых будняў, сутыкнуўся з абыякавасцю да ўрачыстасці. Там, у суседняй хаце, быў незамецены панадворак, мурзатыя дзеці, з якімі гаварыць не далося. У сенях куры, ахрап'е кінутае абы як. Адчуў тут дзіўныя супярэчлівасці з маімі ўяўленнямі свята, а, можа, і жыцця. Вось хаця б і аповесць Евіля пра тэлефон. Праўда, тое, што казаў, ці не, хіба нейк можна праверыць. Зрэшты, я тады яшчэ ніколі не бачыў тэлефона, не чуў радыё. Патэфон толькі меў нехта ў вёсцы — з іголкамі і пласцінкамі. Прыемна было слухаць музыку і цікава, як гэта ўсё ў той скрынячцы зроблена. Але казалі, што ў Слабадзе быў яшчэ дзядуля, які дужа злаваўся на ўладальніка патэфона: „Шкарадзь, — казаў, — брухамоўца. Ходзіць з каробкай, людзей абдурваць. Сам бурчыць, прытвараецца, а цябе ўгаварыць хочуць, што гэта ягоная машына такая разумная". Быццам смешна, толькі ці сапраўды праўду ад выдумкі адрозніць немагчыма? Толькі ці вясковыя людзі мелі час праўду шукаць? Трэба ж было кусты церабіць над возерам, камяні, якіх на полі было як насеена, сабіраць у крушні. Крушні ляжалі ўсюды, і на межах, і пры дарогах. Іван Малько, які ў немцаў некалі быў „пленнікам", казаў, што там з каменя хлявы і хаты будуюць, тут часам хто-небудзь у падмуроўку клаў іх. На хутары бацькі, блізу хаты ляжалі буйныя валуны. І багата іх там было ў адным месцы, на ўзгорку. Нехта гаварыў, што быццам некалі там нейкія могілкі былі, але цяжка ў гэта паверыць. А вось некаторыя камяні знаходзілі сваё прымяненне. З іх мужыкі рабілі жорны. Дзядзька Юстын, калі перабраўся на хутар, рашыў таксама мець свае жорны. Былі яны ў гаспадарцы неабходныя. Каб асыпку для жывёлы змалоць, ячмень на крупы (вядома, яго раней у ступе з тоўстага бервяна зробленай, абтаўчы з мякіны трэба) або авёс на талакно падрыхтаваць. Між людзьмі, якія сноўдаліся па нашай дарозе, з'явіўся і такі дзядзька, што рабіў жорны. Казалі, што ён ноччу, цераз мяжу з савецкага боку прыходзіў. Жорны Юстыну зрабіў. Камяні „абчасаў", каб круглымі сталі, у адным дзірку выкалупаў, каб жменькай зерне туды сыпаць. Так, жменькай. Ці хто сёння думае пра тое, што некалі селянін „хлеб" сеяў жменькай, жаў „ураджай" сярпом па жменьцы, у ступу зерне сыпаў жменькай, у жорны таксама (калі меў што). З павагай, панове, да хлеба! З пашанай да чалавечай працы. Бо каму хацелася б цяпер сахой араць і сярпом, сагнуўшы хрыбет на полі ў жарышча жменькамі збажыну ўбіраць? А тое, што ёсць краіны, дзе людзі галадаюць... мы ж хрысціяне...

Цяпер з дапамогай гаспадарцы прыходзіць тэхніка. Ужо за маёй памяці сахой у нас толькі бульбу „абганялі". Цэпам таксама, каб „талакой", дык мала хто малаціць умеў. З суседняй вёскі гаспадар малатарню меў з прыводам і ездзіў восенню ад така да така. У прывод коней запрагалі — і мне даводзілася коней паганяць па „круглай дарозе". Толькі Давідовічы-акутшчыкі мелі сваю малатарню з драўляным, архаічным прыводам. Я любіў, калі гарох малацілі. Мог тады набраць гароху ў кішэнь, а потым яго пражыць на скаварадзе. Струкі гароху выбіраў я і раней, калі ён быў пакладзены сцяной у друкі для сушэння. Раз гарох у кішэні высах, я яго проста выкінуў за хляўком. А гарох пачаў расці. Дзядзька ўжо ведаў каму за гэта вушы нацерці. А пражыць гарох сам не меў дзе. Хадзіў да сяброўак Соні і Хрэсці, дзяўчынак Івана Малька. Іхняя мачыха гарох пражыла. Калі я хадзіў да іх „на сяло", мы тады сядзелі на печы і байкі апавядалі, або загадкі сабе задавалі. Узімку на печы было найцяплей. На хаце ў час марозу, дык хаця звонку вокны, дзеля ацяплення, былі забяспечаны матамі з кастрой, то і так клямкі ў дзвярах да пальцаў прыліпалі. А ў бацькавай хаце, апрача вялікай печы быў „шчыток". Вечарам бацька яго „тапіў" (мой бацька толькі па-руску гаварыў) і калі ўжо гарэлі ў ім сасновыя, або бярозавыя палены, водблескі агню праз шчыліну ў дзверцах паўзлі зайчыкамі па сценах. На шыбах мароз рысаваў пальмы і іншыя цудоўныя ўзоры. Часам ад марозу лопалі бярвенні ў сценах, як быццам хто страляў за вуглом.

(працяг будзе)

Анатоль Маўчун

Гэта было пад Кёнігсбергам (3)

Расказвае Марфа РАМАНЧУК, жыхарка Кузавы Чаромхаўскай гміны.

(працяг; пачатак у 51 нумары)

Пачуліся выстралы і крыкі. Стральба ўзмацнялася і даходзіла з вёскі. Федзя з Толікам (хлапец з Вулькі-Нурэцкай, які з Федзем на гаспадара працавалі) былі цікавымі пайсці і высветліць справу, але Таня не пусціла. Падаліся затым у вёску наступнага ранку. Вярнуліся са страшнай навінкай. Рускія застрэлены. У адным доме дванаццаць салдат забітых, у другім — трынаццаць. Побач на падлозе дзяўчаты ляжалі з прастрэленымі галовамі. Неўзабаве справа высветлілася. За „перадавой" падаваўся атрад артылерыі, які спыніўся ў вёсцы на адпачынак. Салдаты сабралі мясцовых дзяўчат і загулялі пры выпіўцы. У гэты час немцы з'явіліся. Пастралялі ап'янеўшых салдат і жанчын.

З таго часу, як адна ў хаце была, дык дзверы на ключ замыкала. Выдаіўшы кароў, малако да хаты прынесла. За дзвярыма пачула крокі і нямецкую гаворку. Паціхоньку выняла ключ. Стрымаўшы дыханне, прытулілася ў куточку. Хтосьці паспрабаваў адчыніць дзверы. Былі зачынены. Грукатанне паўтарылася. „Пэўна гаспадары выехалі і не вярнуліся", — гаварылі між сабою незнаёмцы. Пачула я сціхаючыя крокі. Праз фіранку ўбачыла пецярых вайскоўцаў у нямецкіх уніформах. Замкнула я хату і да Мартыновічаў пабегла. У суседа ні аб чым іншым не гаварылі, як толькі аб справе на вёсцы. У кватэру зайшлі пецярых немцаў. Загаварылі аб учарашняй перастрэлцы. Затым адзін сказаў Федзьку, каб паехаў і рускага раненага забраў. Гаспадар адмовіў. Тлумачыў, што яго застрэляць за ўспамаганне рускіх. Тады немец паясніў: „Зараз адходзім. Чалавека ратаваць трэба". Дамовіліся, што двух паедзе з мужыкамі фурай, а трох будзе чакаць за вёскай. Ранены ляжаў побач гарматы, напалову засыпаны пяском. Не паказваў знаку жыцця. Паклалі яго на фуру. Завезлі на кватэру непадалёк Федзькавай хаты. Пабегла і я туды. Разам з Ірэнай, палячкай, апекаваліся танкістам. Параненыя двое сутак ляжаў непрытомны. Пульс працаваў. Паспрабавалі вады ў рот уліць. Лыжкай расшчапілі зубы. Затым ваду падалі. Праглынуў. Варухнуўся непаваротліва. Расплюшчыў вочы. „Дзе салдаты?" — ледзь чутна прашаптаў. „Забіты", — гавару. — Мы подданыя рабочыя з Польшчы. У нямецкага хазяіна работалі", — паясніла я. — „Передайте нашим пусть меня в больницу отвезут. Страшно больно..."

З ног параненага выцягнула я тры асколкі. Чацвёртага, які вышэй калена знаходзіўся, не змагла. Глыбока пранік у цела. Сагрэлі з Ірэнай ваду. Напоўнілі бутэлькі, затым гарачы кампрэс да ног прыклалі.

Другі тыдзень мінаў, як адна гаспадарыла ў хаце. Адвячоркам пайшла да суседзяў. Пры змроку пачулі грукатанне ў акно. Калі Федзька адчыніў дзверы, дык я ўбачыла Агату. „Пойдзем дахаты, штосьці важнае скажу, — шэптам загаварыла. У хаце прыбавіла: — Неўзабаве немцы прыйдуць. Моцна злыя. Рускіх і палякаў расстрэльваюць. Пайдзі наверх у спальню. Закутай галаву шалем. Прытварайся, што зубы баляць". Ранкам на панадворку процьму немцаў убачыла. Усе былі апрануты ў маскіровачна белыя камбінезоны. Зайшоў у дом афіцэр з некалькімі салдатамі. Папытаў, хто знаходзіцца ў памяшканні. Немка адказала, што ў спальні хворая служанка. Праверылі. „Немка?" запытаў афіцэр. Я хіснула галавою, гаспадыня пацвердзіла.

Панадворак апусцеў. Зараз, як немцы ад'ехалі, пачулася стральба. Агата з бацькамі ў склеп схаваліся, а я на паддашак падалася. Паглядзела адкуль стралялі. Рускія ішлі на хутар. Выбегла я на панадворак сваіх прывітаць. З-за хаты выйшаў тоўсты немец з біноклем. Пачуўся выстрал. Немец зваліўся на мяне як сноп. На галаве я ўбачыла кроў. Быў нежывы. Спалохана пабегла дамоў, спусцілася ў склеп. На тварах гаспадароў рысаваўся страх. Заскрыпелі дзверы, у памяшканні пачуліся крокі. Спалохана глядзелі мы ў пакрыву склепу. Вецер хістануў дзверчыкамі, якія выходзілі на паддашак. Пачуўся выстрал — адзін, другі...

(заканчэнне будзе)

Запісаў Уладзімір Сідарук

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Чучалы мядзведзяў у Прыродна-лясным музеі ў Белавежы

Па мядзведжых слядах

На нашым еўрапейскім кантыненце мала маецца такіх месц, дзе разам выступаюць тры найбольшыя чатырохногія драпежнікі: воўк, рысь і мядзведзь. У Польшчы такім месцам астаюцца толькі Карпаты. Даўней такім месцам была Белавежская пушча, але апошніх пяць мядзведзяў упаляваліі тут у 1869-80 гадах.

Месцазнаходжанні мядзведзя

У мінулым мядзведзі жылі па ўсёй Польшчы, але з канца XIX ст. асталіся толькі ў Карпатах. Ды і ў Еўропе выступаюць яны толькі на астраўных участках у горах. Дзесяць гадоў раней лік польскіх мядзведзяў дасягаў парадку 120-140 штук. Рост польскай папуляцыі мядзведзяў шчыльна звязаны з яго буйным расплодам у славацкай частцы Карпат у палове 80-х гадоў, дзе налічвалася іх 790 штук. Ва ўкраінскіх Карпатах у 1970 годзе было 1 300 мядзведзяў; дзеля параўнання: некалькі дзесяткаў гадоў раней было іх там толькі сто.

Белавежскія мядзведзі

Мядзведзь у Белавежскай пушчы прапаў у час расійскага панавання. Сам цар Мікалай II быў страсным паляўнічым і паляваў два-тры разы ў год.

Арганізаванае вынішчэнне драпежнікаў у Белавежскай пушчы царскія ўлады пачалі ў другой палове XIX стагоддзя. У 1869-80 гадах было там праведзена 188 аблаў, у час якіх застрэлена і атручана 38 рысяў, 471 воўк і пяць апошніх мядзведзяў. Пасля, у 1888-1902 гг., вынішчана было ўсё, што мела іклы і кіпцюры, улічваючы ласак, арлоў і соек.

Як цікавінку варта згадаць, што ў час палявання цара Мікалая II у 1897 годзе быў зняты першы ў Белавежы і на Беласточчыне фільм. Здарылася гэта праз няцэлыя два гады ад вынаходкі братамі Люм'ер кінематографа. На кінаплёнцы эпізоды з царскага палявання ўвекавечыў манаршы кінематаграфіст Баляслаў Матушэўскі.

Палююць для трафеяў

У Расіі, дзе ў 1976-86 гг. колькасць мядзведзяў пабольшала з 60 тысяч да 90 тысяч, паляванні на бурых мядзведзяў маюць укаранелыя традыцыі. У 1991 годзе з 92 662 штук упалявалі 2 794, што складае 3,01% пры дапушчальнай дзесяціпрацэнтнай норме. Вучоныя мяркуюць, што папуляцыя бурага мядзведзя на расійскіх Далёкім Усходзе, Камчатцы і Каўказе знаходзіцца пад пагрозай. Раней на мядзведзяў палявалі для мяса, а сёння робіцца гэта дзеля такіх трафеяў як кіпцюры і футра ды для здабычы яго жоўці, якая з'яўляецца лекавай сыравінай.

Сімвалічная роля мядзведзя

Драпежныя млекакормячыя, у іх ліку і мядзведзь, з незапамятнага часу распальвалі асаблівыя страсці. З аднаго боку захапляла сіла і краса іх сілуэта, а з другога трывожыла іх крыважэрнасць і шкоднасць. Чалавек у амаль кожнай цывілізацыі надзяляў звяроў спецыфічнай сімволікай дзеля ілюстравання акрэсленых з'яў. У хрысціянскай іканаграфіі мастакі карысталіся выявай мядзведзя, каб уявіць гледачу вобраз сатаны. У гэтым значэнні часта выступае ён у сярэдневяковым мастацтве ў сцэнах змагання з чалавекам. Гэтак прыгадвалася змаганне Давіда з мядзведзем, апісанае ў 1 Кнізе царстваў (17, 34-37). У 4 Кнізе царстваў (2, 23-24) мядзведзі былі выкарыстаны прарокам Елісеем для пакарання 42 дзяцей, якія высмейваліся з прарокавай лысіны. У персаніфікацыі станоўчых і адмоўных бакоў чалавечага характару мядзведзь прадстаўляўся як сімвал злосці, юру, нечыстаты і гвалту, часам з доляй сімпатыі, як у Кнізе прыказак Саламона: „Лепш чалавеку спаткаць мядзведзіцу пазбаўленую дзяцей, чым дурня з ягонай дурнотай" (Пр. 17, 12).

Значэнне некаторых моўных фраз неаспрэчнае, напрыклад, „Дужы як мядзведзь". Ёсць, аднак, і такія прымаўкі, якія набылі кантэкставае значэнне, напрыклад, „Паехаць на белыя мядзведзі" абазначае ссылку палітычнага апанента ў Сібір.

Міхал Мінцэвіч

Сябры-карэспандэнты

Калі я пачаў пісаць у „Ніву", а было гэта ў пачатку 1960-х гадоў, ужо тады паяўляліся ў „Ніве" прозвішчы карэспандэнтаў Васіля Петручука, Уладзіміра Сідарука, Мікалая Панфілюка; былі і іншыя знакамітыя карэспандэнты — Дзядзька Квас, Няплоха, Аляксандр Закройшчык, Федар Хлябіч, Іван Кірызюк і г.д. Некаторыя карэспандэнты адышлі ў вечны спачын, няхай ім зямля будзе пухам, некаторыя парвалі сувязь з „Нівай", проста перасталі пісаць, а некаторыя „перахрысціліся" і перайшлі да ўкраінцаў. Бог з імі.

Найбольш вернымі прыяцелямі „Нівы" асталіся Петручук, Сідарук і Панфілюк. Яны не парвалі сувязі з „Нівай" і надалей пішуць.

Трапіў мне рукі здымак са з'езду карэспандэнтаў „Нівы" з 1976 года, калі першае месца заваяваў спадар Мікалай Няплоха. Як быў аб'яўлены „Нівай" конкурс, дык за Панфілюком, Сідаруком і Петручуком, цяжка было прабіцца ў першую тройку, але часам і мне ўдавалася быць у той тройцы.

Цяпер са старэйшых сяброў-карэспандэнтаў найактыўнейшы — Уладзімір Сідарук. Ягоныя допісы можна прачытаць амаль у кожным нумары „Нівы". Рэдка паяўляецца на старонках „Нівы" Васіль Петручук, а Мікалай Панфілюк, калі пайшоў на пенсію, таксама радзей піша ў „Ніву". Я са шчырым сэрцам звяртаюся да вас, сябры-карэспандэнты, не забывайце пра „Ніву", пішыце як найбольш, а цяпер ёсць аб чым пісаць вельмі многа.

Адышлі з „Нівы" і журналісты, заснавальнікі тыднёвіка, як спадарства Георгій і Вера Валкавыцкія, Міхась Хмялеўскі, Яніна Чэрнякевіч і Янка Целушэцкі, а ў вечнасць — Васіль Баршчэўскі, Аляксей Карпюк, Віктар Рудчык, Мікола Гайдук і Міхась Шаховіч, няхай і ім зямля будзе пухам.

Варта было б якась спаткацца старэйшым — ветэранам „Нівы", пагаварыць аб мінулым і цяперашнім нашым жыцці. Не забывайма аб „Ніве"!

Мікалай Лук'янюк

***Ад рэдактара:** Рэдакцыя „Нівы" заўсёды шчыра вітае нашых карэспандэнтаў у сваіх рэдакцыйных парогах. Ваша прапанова сустрэцца старэйшым і маладзейшым сябрам „Нівы" вельмі нас цешыць і забавязвае. Спадзяюся, што ў бліжэйшым часе будзем мець нагоду сустрэцца ў вялікай сям'і нашай газеты.*

Маляванне яе вялікім захапленнем

Малгажату Тарасевіч да малявання цягнула ўвесь час. Зачараваў яе казачны, багаты свет колераў і іх адценняў. Прыгожа малявала яна ў Пачатковай школе ў Міхалове. Задумала вучыцца ў Пластычным ліцэі ў Супраслі. Пасля яго заканчэння, ужо дзесяць гадоў працуе інструктаркай у Гмінным цэнтры культуры ў Міхалове. Вядзе заняткі ў пластычным гуртку, у якім займаюцца дзеці і школьная моладзь. Гурток часта ладзіць выстаўкі рысункаў. Яны прыцягваюць увагу гледачоў сваім высокім мастацкім узроўнем. Варта дадаць, што следам маці Малгажаты пайшла дачка Поля. Яна таксама таленавітая мастачка. Яе рысункі публікуе мясцовы штомесячнік „Газета Міхалова і ваколіц".

Міхалоўскі ГЦК арганізоўвае конкурсы, між іншым, апошнім часам на статуэтку „Міхалка", на навагоднюю паштоўку і г.д.

Пад канец мінулага года падсумавалі конкурс на праект статуэткі „Міхалка". Журы мела да ацэнкі пару дзесятак прац: рысункаў ды статуэтак з гліны, пластыліну, кардону і папяровай масы. Першае месца заняла Анна Бура, другое — Марыя Тамашэўская, трэцяе — Анэта Лукша. Усе яны вучаніцы пачатковых школ у Міхалоўскай гміне. Малгажата Тарасевіч мае падставу да задавальнення. Гэта і яе падапечныя, яе выхаванкі. (яц)

Што ў 2004 годзе?

У перадапошні дзень мінулага года адбылася XI сесія Гміннай рады ў Нараўцы. Галоўным чынам прысвечана яна была праекту бюджэту гміны на 2004 год. У пачатку 2004 года будзе пакрыта бляхай святліца (яна ў колішняй школе) у Альхоўцы. Асфальт пакладуць на дарогах з Нараўкі ў Янава ды з Лешукоў у Сушчу, а таксама, мабыць, ад шашы з Нараўкі ў Гайнаўку да вёскі Скупава.

Дэпутаты далі згоду на пабудову каналізацыі ў Семяноўцы і ў Заблотчыне, а таксама на пракладку новых тратуараў у Нараўцы. У Нараўцы таксама будуць класці каналізацыйныя трубы побач маставых на некаторых вуліцах.

У канцы 2003 года гмінныя ўлады ссеклі і прадалі 75 прыдарожных тапоняў. Добраўпарадкавалі гравейку з Лешукоў у Сушчу.

Падчас сесіі дэпутаты вырашылі, якія зямельныя ўчасткі прадаць на тэрыторыі Нараўчанскай гміны, між іншым, у Нараўцы, Плянце і Скупаве. Купіць іх намераны прадпрыемствы і жыхары гэтай гміны. Адны хочуць павялічыць продаж парафіну (у Плянце), іншыя — запачаткаваць продаж газу пропан-бутан (каля Нараўкі), а яшчэ хто проста не ўпусціць каму іншаму зямельную дзялянку.

Улады Нараўчанскай гміны згадзіліся, каб падчас Калядных свят ноччу ўвесь час гарэла вулічнае святло ў тых вёсках, у якіх ёсць цэрквы (Нараўка, Семяноўка, Старое Ляўкова) і ў суседніх сёлах. Каб жыхарам гэтай гміны было відней ісці ў царкву і вяртацца назад дадому. (яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Nakład: 1 393 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2004 r. upływa 5 marca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Анкета

Запрашаем Чытачоў прыняць удзел у анкеце, якая дапаможа нам лепш пазнаць Вашы зацікаўленні і дастасаваць да іх наш тыднёвік. Чытачы, якія запоўняць анкету і дашлюць яе да 8 лютага ў нашу рэдакцыю, прымуць удзел у жараб'ёўцы кніжак і кампакт-дыскаў з беларускімі песнямі.

Хто нас чытае?

Узрост
- ❑ да 25 гадоў
- ❑ 26-30 гадоў
- ❑ 31-35 гадоў
- ❑ 36-45 гадоў
- ❑ 46-55 гадоў
- ❑ 56-65 гадоў
- ❑ больш

Месца пражывання
- ❑ вёска
- ❑ гмінны цэнтр
- ❑ павятовы горад
- ❑ Беласток
- ❑ па-за межамі Беласточчыны

Адукацыя
- ❑ падставовая
- ❑ прафесійная
- ❑ сярэдняя
- ❑ ліцэнцыят
- ❑ вышэйшая

Прафесія
- ❑ вучань
- ❑ студэнт
- ❑ беспрацоўны
- ❑ рабочы
- ❑ земляроб
- ❑ навуковы работнік
- ❑ работнік дзярж. адміністрацыі
- ❑ канцылярскі работнік
- ❑ кіраўнічая пасада
- ❑ свабодная прафесія
- ❑ уласная дзейнасць
- ❑ пенсіянер
- ❑ іншая, якая: .....

.....

Зацікаўленні
- ❑ палітыка
- ❑ гісторыя
- ❑ цывілізацыя
- ❑ культура
- ❑ навука
- ❑ спорт
- ❑ бізнес і фінансы
- ❑ іншыя, якія: .....

.....

Як нас купляеце?

Як часта купляеце „Ніву"
- ❑ заўсёды
- ❑ некалькі разоў у год
- ❑ раз у год
- ❑ купіў толькі раз

У які спосаб атрымоўваеце „Ніву"
- ❑ падпіска ў школе
- ❑ падпіска ў „Руху"
- ❑ падпіска па пошце
- ❑ падпіска ў рэдакцыі
- ❑ купляю ў кіёску
- ❑ купляю на пошце
- ❑ купляю ў магазіне
- ❑ у бібліятэцы або чытальні
- ❑ атрымоўваю ад знаёмых
- ❑ чытаю інтэрнэтнае выданне
- ❑ іншы, які: .....

.....

Што схіліла Вас купіць „Ніву" ўпершыню?
- ❑ змест
- ❑ загаловак
- ❑ знаёмыя
- ❑ выпадак
- ❑ агляд „Нівы" па радыё
- ❑ іншае, што: .....

.....

.....

Што пра нас думаеце?

Ці „Ніва" прадстаўляе аб'ектыўны вобраз рэчаіснасці?
- ❑ так
- ❑ не
- ❑ па меры аб'ектыўна
- ❑ па меры суб'ектыўна
- ❑ цяжка сказаць

Тыднёвік надта многа месца адводзіць
- ❑ палітыцы
- ❑ гісторыі
- ❑ цывілізацыі
- ❑ культуры
- ❑ навуцы
- ❑ рэлігіі
- ❑ дэбатам
- ❑ каментарыям
- ❑ іншым, якім: .....

.....

.....

.....

Тыднёвік надта мала месца адводзіць:
- ❑ палітыцы
- ❑ гісторыі
- ❑ цывілізацыі
- ❑ культуры
- ❑ навуцы
- ❑ рэлігіі
- ❑ дэбатам
- ❑ каментарыям
- ❑ іншым, якім: .....

.....

.....

.....

Як ацэньваеце першую старонку „Нівы"
- ❑ вельмі цікавая
- ❑ цікавая
- ❑ манатонная
- ❑ цяжка сказаць
- ❑ іншыя заўвагі

Самыя важныя каштоўнасці „Нівы"

.....

.....

.....

.....

Самыя важныя заганы „Нівы"

.....

.....

.....

.....

Рэклама

Ці звяртаеце ўвагу на рэкламу ў „Ніве"
- ❑ так
- ❑ не
- ❑ рэдка
- ❑ ніколі
- ❑ цяжка сказаць

Ці рэклама ў „Ніве" схіліла Вас пакарыстацца прапановай
- ❑ часта
- ❑ часам
- ❑ ніколі
- ❑ цяжка сказаць

Ці лічыце, што ў „Ніве" павінна друкавацца рэклама
- ❑ так
- ❑ не
- ❑ цяжка сказаць

Прозвішча .....
Імя .....
Адрас .....
.....
.....

Адгаданка

1					
2					
3					
4					

1. традыцыйны жаночы галаўны ўбор, 2. характэрная парная частка жаночага цела, 3. напр. Нарач, 4. вузкія сталёвыя палазкі для катання па лёдзе. (Ш)

Рашэннем адгаданкі будзе слова ў светлай калонцы. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 47 нумара

Лыка, пералік, Пілат, род, рыба, хінін.

Рашэнне: **Ліхі работнік праклінае прылады**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем Лявону Федаруку з Рыбалаў і

Адказ на адгаданку з 48 нумара

Бой, Быхаў, вусач, жыд, лес, лой, пешка.

Рашэнне: **Свой хлеб лепшы ад чужой каўбасы**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем Міхалу Байко з Беластока.

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

— Нядаўна выйшла я замуж...
— І што? Лепш цяпер?
— Мо не лепш, але часцей.

* * *

Размаўляюць дзве сяброўкі:
— Я ніколі не здрадзіла свайму мужу...
— Хвалішся ці наракаеш?

* * *

Цыган зайшоў да гаспадара і просіць паесці.
— Добра, — згаджаецца гаспадар, — накармлю цябе міскай кашы, але пры адной умове: калі пахваліш ежу — паб'ю цябе, калі зганіш — таксама паб'ю ды і калі нічога не скажаш, тожа адлупцую.
Цыган згадзіўся і з'еў міску кашы.
— Ну і як? — пытае гаспадар.
— Яшчэ, калі ласка, адну міску, бо пакуль не ведаю.
Гаспадар наклаў другую міску і калі госць з'еў, пытае:
— І як: добрая была каша?
— Такая ж, што і ў першай місцы.

* * *

Медсястра да лекара:
— У чакальні сядзіць хворы, які быў ужо ва ўсіх дактароў...
— І на што ён наракае?
— Менавіта на тых дактароў.

* * *

Паляўнічы ідзе на паляванне. Сустракае яго леў:
— Што: на паляванне выбраўся?
— Н-н-не, далібог на рыбы.

ISSN 0546-1960